Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра беларускага мовазнаўства

**С.В. Мартынкевіч**

# ВУЧЭБНАЯ І ВЫТВОРЧАЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ-ФІЛОЛАГАЎ

***Метадычныя рэкамендацыі***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2013*

УДК 81(076)
ББК 81р30
М29

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 7 ад 29.04.2013 г.

Аўтар: старшы выкладчык кафедры беларускага мовазнаўства ВДУ імя П.М. Машэрава **С.В. Мартынкевіч**

Рэцэнзент:
дацэнт кафедры агульнага і рускага мовазнаўства
ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат педагагічных навук
*С.У. Нікалаенка*

**Мартынкевіч, С.В.**
**М29** Вучэбная і вытворчая педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў : метадычныя рэкамендацыі / С.В. Мартынкевіч. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 47 с.

Метадычныя рэкамендацыі па вучэбнай і вытворчай практыках студэнтаў філалагічнага факультэта акрэсліваюць задачы педагагічнай практыкі і кірункі дзейнасці студэнтаў, змяшчаюць патрабаванні, раскрываюць асноўныя арганізацыйныя прынцыпы. У выданні прапанаваны ўзоры афармлення планаў-канспектаў урокаў беларускай мовы і літаратуры, справаздачнай дакументацыі.

Прызначаецца кіраўнікам педагагічнай практыкі, студэнтам дзённай і завочнай формаў навучання.

**УДК 81(076)**
**ББК 81р30**

© Мартынкевіч С.В., 2013
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013

Репозиторий ВГУ

# ПРАДМОВА

Важным этапам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў з'яўляецца педагагічная практыка студэнтаў, у працэсе якой папаўняюцца і абагульняюцца набытыя веды па псіхалогіі, педагогіцы, дысцыплінах філалагічнага цыклу, методыках выкладання беларускай мовы і літаратуры. Студэнты знаёмяцца з арганізацыяй вучэбна-выхаваўчага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, набываюць навыкі самастойна весці выхаваўчую і вучэбную працу з вучнямі, улічваючы іх узроставыя і псіхалагічныя асаблівасці, умовы навучання.

Педагагічная практыка прадугледжвае павышэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню студэнтаў, фарміраванне навыкаў вучэбнай камунікацыі, педагагічнага суразмоўніцтва.

Вучэбная практыка дае магчымасць студэнтам непасрэдна пазнаёміцца з працай сучасных устаноў адукацыі, паназіраць за распрацоўкай зместу і формаў навучання, прымяненнем метадаў, прыёмаў у працэсе рэалізацыі асноўных адукацыйных і выхаваўчых мэт. Важнай асаблівасцю вучэбнай практыкі з'яўляецца тое, што студэнт на першапачатковым этапе навучання мае магчымасць наглядна ўбачыць, як усталёўваюцца міжасобасныя зносіны вучняў пэўнага класа, як паводзяць сябе настаўнікі ў розных педагагічных сітуацыях, як фарміруецца ў іх стыль выкладання. Студэнт уключаецца ў сістэму педагагічнага ўзаемадзеяння "настаўнік–вучань", што дазваляе яму надалей свядома вывучаць псіхолага-педагагічныя якасці вучняў і вучнёўскага калектыву ў цэлым.

У час вытворчай педагагічнай практыкі студэнты комплексна вывучаюць сістэму вучэбна-выхаваўчай работы ўстаноў агульнай адукацыі, ажыццяўляюць вучэбную і пазакласную працу па беларускай мове і літаратуры, пазакласную выхаваўчую працу, арганізуюць навукова-даследчую працу па праблемах педагогікі і псіхалогіі. Ва ўмовах актыўнай педагагічнай практыкі ў студэнтаў з'яўляецца магчымасць асэнсаваць змест будучай прафесійнай дзейнасці, узбагаціць сябе новым вопытам, прымяніць псіхолага-педагагічную тэорыю і апрабаваць метадычныя веды. Практыканты могуць пераканацца ў правільнасці выбару прафесіі, выявіць ступень уласнай гатоўнасці да самастойнай працы ва ўстановах адукацыі.

Такім чынам, галоўнымі аспектамі педагагічнай практыкі з'яўляюцца вучэбны, выхаваўчы і даследчы аспекты, пры рэалізацыі якіх фарміруецца прафесійная кампетэнцыя студэнтаў на аснове набытых навукова-тэарэтычных ведаў і непасрэднай практычнай дзейнасці.

Рэпазіторый ВГУ

# МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І ФУНКЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ-ФІЛОЛАГАЎ

***Мэтавае*** прызначэнне педагагічнай практыкі студэнтаў ў тым, каб паглыбіць і замацаваць атрыманыя на занятках ва ўніверсітэце тэарэтычныя веды для далейшага іх выкарыстання ў ходзе настаўніцкай дзейнасці; навучыцца выконваць усе функцыі настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка; апрабаваць традыцыйныя формы і сучасныя тэхналогіі пры навучанні беларускай мове і літаратуры ва ўмовах агульнай сярэдняй адукацыі.

Акрэсленая мэта вызначае наступныя ***задачы*** педагагічнай практыкі:

- павышэнне ўзроўню адаптацыі студэнтаў да прафесійнай педагагічнай дзейнасці;
- фарміраванне прафесійна-педагагічных уменняў і навыкаў арганізацыі вучэбнай і выхаваўчай працы;
- фарміраванне падрыхтаванасці да комплекснага ўжывання ведаў і ўменняў па філалагічных, псіхолага-педагагічных дысцыплінах, методыках выкладання беларускай мовы і беларускай літаратуры;
- развіццё ў студэнтаў каштоўнаснага стаўлення да прафесіі педагога, адказнасці за вынікі педагагічнай працы.

У працэсе педагагічнай практыкі адбываецца:

– азнаямленне з сістэмай вучэбна-выхаваўчай працы ва ўстанове адукацыі іаналіз стану гэтай працы, вывучэнне прынцыпаў арганізацыі адукацыйнага працэсу і асаблівасцей кіравання ім у навучальнай установе, нарматыўнай дакументацыі;

– далучэнне студэнтаў да практычнай педагагічнай дзейнасці, знаёмства з педагагічным вопытам, знаёмства з сістэмай працы настаўніка па беларускай мове і літаратуры;

– аналіз і вывучэнне сістэмы выхаваўчай працы з вучнямі ў навучальнай установе; засваенне сістэмы працы класнага кіраўніка, якая ўключае ўзаемадзеянне з органамі самакіравання ва ўстанове адукацыі (на ўзроўні класа, установы адукацыі), вучнёўскімі арганізацыямі і аб’яднаннямі, бацькамі;

– вывучэнне асобы вучня і вучнёўскага калектыву;

– развіццё ў студэнтаў-практыкантаў уменняў арганізоўваць цэласны вучэбна-выхаваўчы працэс, ажыццяўляць кіраванне ім шляхам маніторынгу, кантролю, ацэнкі.

Рэалізацыя названых мэты і задач педагагічнай практыкі накіравана на тое, каб праз уключэнне студэнтаў у розныя віды педагагічнай дзейнасці спрыяць фарміраванню прафесійна-педагагічных кампетэнцый, якія вызначаюцца ўзроўнем здольнасці



Репозиторий ВГУ

студэнта ўжываць атрыманыя псіхолага-педагагічныя і спецыяльныя веды і ўменні для паспяховага вырашэння прафесійных задач.

***Функцыі*** педагагічнай практыкі:

– *планава-праектавальная* (рэалізуецца ў тым, што ў практыкантаў фарміруюцца ўменні праектаваць навучанне беларускай мове на працягу вучэбнага года, чвэрці, планаваць вывучэнне асобнага раздзела, працу над канкрэтнай тэмай; вызначаць і фармуляваць мэты ўрока з улікам функцый навучання; прадумваць метадычную структуру ўрокаў розных тыпаў з выкарыстаннем разнастайных сродкаў навучання);

– *адукацыйная* (рэалізуецца ў выкарыстанні засвоеных у працэсе навучання ў ВНУ сістэмы прафесійна-педагагічных ведаў і сфарміраваных уменняў і навыкаў у накіраванай педагагічнай дзейнасці, якія спачатку ўжываюцца на ўзор, а потым – у новай сітуацыі і на ўзроўні творчай дзейнасці);

– *развіццёвая* (рэалізуецца ў працэсе ўзбагачэння новымі ведамі і першапачатковым педагагічным вопытам, дзякуючы якому фарміруюцца прафесійна значныя якасці асобы і педагагічнае майстэрства настаўніка);

– *выхаваўчая* (рэалізуецца праз усведамленне студэнтамі-практыкантамі уласных прафесійна значных і асобасных якасцей, патрэбы ў педагагічнай дзейнасці і магчымасці адказна яе выконваць, педагагічных здольнасцей, каштоўнасных арыенціраў);

– *арганізатарская* (рэалізуецца праз авалодванне правіламі арганізацыі дзейнасці выкладання, фарміраванне ўменняў падтрымліваць увагувучняў, арганізоўваць індывідуальную, групавую, калектыўную формы працы вучняў на ўроку, актывізаваць іх пазнавальную дзейнасць);

– *камунікатыўная* (рэалізуецца праз педагагічнае суразмоўніцтва і адпаведнасць патрабаванням да маўленчых паводзін настаўнікаі культуры маўлення, нормам педагагічнай этыкі і этыкету);

– *дыягнастычная* (рэалізуецца праз фарміраванне ўменняў ацэньваць вынікі дзейнасці вучняў і ўзроўню засваення імі ведаў, уменняў і навыкаў, вызначэння прычын адхілення ад запланаванага выніку);

– *аналітычная* (рэалізуецца ў працэсе аналізу практыкантамі ўласнай прафесійнай дзейнасці з мэтай вызначэння засвоеных у ВНУ ведаў псіхолага-педагагічнага і лінгваметадычнага цыклаў, сфарміраваных на іх аснове дыдактычных уменняў як паказчыкаў падрыхтаванасці да самастойнай працы);

– *сацыяльная* (рэалізуецца ў працэсе адаптацыі студэнтаў-практыкантаў да прафесійнай дзейнасці і ўсведамлення сацыяльнай значнасці асобы настаўніка).

Рэпазіторый ВДУ

Педагагічная адаптацыйна-азнаямленчая практыка студэнтаў філалагічнага факультэта праводзіцца пасля вывучэння базавых курсаў псіхалогіі, педагогікі; вытворчая – методык выкладання мовы і літаратуры.

У працэсе педагагічнай практыкі канкрэтызуюцца, замацоўваюцца і паглыбляюцца тэарэтычныя веды студэнтаў. Пры рашэнні канкрэтных вучэбна-выхаваўчых задач псіхолага-педагагічныя і спецыяльныя веды набываюць дзейнасны, абагульнены характар, у выніку чаго развіваюцца наступныя прафесійна-педагагічныя **ўменні:**

– аналізаваць вучэбна-выхаваўчую работу, якую праводзяць настаўнікі і студэнты-практыканты;
– ажыццяўляць бягучае і перспектыўнае планаванне педагагічнай дзейнасці;
– вызначаць канкрэтныя вучэбна-выхаваўчыя мэты і задачы на аснове ўліку ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў і асаблівасцей класнага калектыву;
– вывучаць асобу вучня і калектыў з мэтай дыягностыкі іх развіцця і стварэння ўмоў для самавыхавання і самаразвіцця;
– вызначаць адукацыйныя, развіццёвыя і выхаваўчыя задачы ўрокаў, пазакласных заняткаў па прадмеце; адэкватна адбіраць вучэбны матэрыял;
– абгрунтавана выбіраць і выкарыстоўваць розныя тыпы ўрокаў, формы, тэхналогіі, метады і прыёмы навучання, тэхнічныя сродкі навучання;
– вызначаць мэты і задачы, змест і тэхналогіі навучання, вынікі выхаваўчай працы з класам,
– планаваць і ажыццяўляць працу класнага кіраўніка;
– на аснове вынікаў дыягностыкі і вывучэння асобы вучня, класнага калектыву планаваць і ажыццяўляць педагагічную і карэкцыйную працу з вучнямі;
– усталёўваць педагагічна-мэтазгодныя ўзаемаадносіны з класам, асобнымі вучнямі, бацькамі, настаўнікамі.

У працэсе практыкі ажыццяўляецца праверка ўзроўню педагагічнай накіраванасці і прафесійнай прыгоднасці студэнтаў.

Асноўнымі *крытэрыямі ацэнкі вынікаў* педагагічнай практыкі з'яўляюцца наступныя:
– ступень сфарміраванасці ў студэнтаў псіхолага-педагагічных ведаў і прафесійнальна-педагагічных уменняў студэнтаў;
– узровень прафесійнальнай накіраванасці асобы будучага настаўніка (цікавасць і матывацыя да педагагічнай прафесіі, здольнасць да самарэгуляцыі, самаадукацыі, гатоўнасць да прафесійнага



Репозиторий ВГУ

самаўдасканалення, самастойнасць, ініцыятыўнасць, адказныя і творчыя адносіны да работы і інш.).

Пры гэтым улічваюцца наступныя зместавыя кампаненты прафесійна-педагагічнай характарыстыкі студэнта філалагічнага факультэта:

– сістэма прафесійна-педагагічных ведаў (агульнанавуковыя веды; веды па лінгвістыцы і літаратуразнаўству; веды па педагогіцы і псіхалогіі);

– сістэма прафесійна-педагагічных уменняў і навыкаў (гнастычных, праектавальных, канструктыўных, арганізатарскіх, камунікатыўных);

– сістэма сацыякультурных ведаў;

– асобасныя прафесійна значымыя якасці настаўніка мовы і літаратуры (шырокая эрудыцыя, свабоднае валоданне культурай вуснага і пісьмовага слова, глыбокае разуменне ролі мовы для развіцця мыслення моўнай асобы і ролі літаратуры для фарміравання духоўнага свету чалавека, свабоднае валоданне методыкай выкладання вучэбных прадметаў і інш.)

Для ацэнкі вынікаў практыкі выкарыстоўваюцца наступныя *метады*:

– назіранне за студэнтамі ў працэсе педагагічнай практыкі;

–аналіз якасці вучэбна-выхаваўчай работы, якая праводзіцца практыкантамі;

–гутарка з настаўнікамі, класнымі кіраўнікамі, студэнтамі;

–аналіз дакументацыі студэнтаў (індывідуальных планаў работы, педагагічных дзённікаў, канспектаў ўрокаў, справаздач аб рабоце і інш.);

–анкетаванне (самаацэнка студэнтамі ступені сваёй падрыхтаванасці дапрактычнай работы і якасці сваёй работы);

–аналіз вынікаў навукова-даследчай работы студэнтаў.

Репозиторий ВГУ

## ТЭРМІНЫ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Педагагічная практыка праводзіцца ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных умоў будучай прафесійнай дзейнасці. Студэнты філалагічнага факультэта праходзяць практыку ў 5–11 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

***Азнаямленчая практыка:***

1) I курс, спецыяльнасць “Беларуская мова і літаратура. Практычная псіхалогія” – размеркаваная, на працягу I семестра.
2) I курс, спецыяльнасць “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка” – размеркаваная, на працягу II семестра.

***Азнаямленча-адаптацыйная практыка:***

II курс, спецыяльнасць “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка”; “Беларуская мова і літаратура. Практычная псіхалогія” (IУ семестр)

***Азнаямленча-адаптацыйная практыка:***

III курс, спецыяльнасць “Беларуская філалогія” – размеркаваная, на працягу года.

***Вытворчая педагагічная практыка:***

1) спецыяльнасць “Беларуская філалогія” – на працягу 12-ці тыдняў (5 курс ДФН, IX семестр); 6-ці тыдняў (ЗФН 4 і 5 курсы, УIII і IX семестры);
2) IУ і У курсы ДФН,спецыяльнасць “Беларуская мова і літаратура. Журналістыка”; “Беларуская мова і літаратура. Практычная псіхалогія” – на працягу 6-ці тыдняў (УIII і IX семестры).

Репозиторий ВГУ

## АЗНАЯМЛЕНЧАЯ І АЗНАЯМЛЕНЧА-АДАПТАЦЫЙНАЯ ПРАКТЫКІ

**Азнаямленчая практыка** прадугледжвае азнаямленне з арганізацыяй вучэбна-выхаваўчай працы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, з дакументацыяй (класным журналам, планам выхаваўчай работы класнага кіраўніка), з асноўнымі напрамкамі творчай і метадычнай дзейнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры; з функцыянальнымі абавязкамі класнага кіраўніка (па напрамках); з арганізацыяй самакіравання ва ўстанове адукацыі.

У час вучэбнай азнаямленчай практыкі студэнты комплексна вывучаюць сістэму вучэбна-выхаваўчай работы агульнаадукацыйных устаноў, складаюць характарыстыку асобы вучня або вучнёўскага калектыву.

### ЗМЕСТ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Азнаямленчая педагагічная практыка ўключае:

1) знаёмства студэнтаў з канкрэтнымі ўмовамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу; з кабінетам беларускай мовы і літаратуры;

2) вывучэнне вучэбных праграм, падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў па прадмеце; знаёмства з каляндарным і каляндарна-тэматычным планаваннем урокаў па беларускай мове і беларускай дітаратуры;

3) назіранне за прафесійнай дзейнасцю настаўнікаў-славеснікаў і працай вучняў у працэсе наведвання ўрокаў беларускай мовы і літаратуры.

Студэнт замацоўваецца за адным класам. Практыканты наведваюць урокі ўсіх настаўнікаў у тых класах, за якімі яны замацаваны, а таксама пры магчымасці ўрокі рускай або беларускай мовы і літаратуры і ншых дысцыплін гуманітарнага цыклу лепшых педагогаў установы адукацыі, у якой праходзіць практыка.

Прыкладны змест дзейнасці студэнтаў у час вучэбнай азнаямленчай педагагічнай практыкі:

1. Комплекснае вывучэнне сістэмы вучэбна-выхаваўчай работы ў школе (ліцэі, гімназіі, каледжы) і вывучэнне асаблівасцей класа і асобных вучняў:

– гутарка з адміністрацыяй установы адукацыі, настаўнікамі, класнымі кіраўнікамі;
– знаёмства з планам работы ўстановы адукацыі;
– знаёмства з матэрыяльнай базай установы адукацыі;
– вывучэнне асабістых спраў вучняў, класных журналаў;
– назіранні за вучнямі падчас наведвання ўрокаў па розных прадметах і пазакласных мерапрыемстваў у замацаваным класе;
– гутаркі з вучнямі, бацькамі.

Репозиторий ВГУ

2. Вучэбная і пазакласная работа па прадмеце:
– азнаямленне з абсталяваннем і афармленнем кабінета беларускай мовы і літаратуры;
– вывучэнне каляндарна-тэматычных і паўрочных планаў настаўніка-прадметніка, знаёмства з планам пазакласнай работы па прадмеце;
– наведванне і аналіз урокаў беларускай мовы і літаратуры;
3. Пазакласная выхаваўчая работа:
– знаёмства з планам выхаваўчай работы навучальнай установы;
– вывучэнне плана работы класнага кіраўніка;
– наведванне і аналіз наведаных выхаваўчых мерапрыемстваў у замацаваным класе.

У дзённіку практыканта адлюстроўваецца ўся работа студэнта. У пачатку дзённіка запісваюцца расклад званкоў і расклад урокаў, спіс класа, прозвішчы, імены і імёны па бацьку настаўніка-прадметніка, класнага кіраўніка, дырэктара, намеснікаў дырэктара. Змест дзённіка адлюстроўвае штодзённую працу, усе віды дзейнасці студэнтаў.

**Азнаямленча-адаптацыйная практыка** арганізуецца пасля вывучэння студэнтамі курсаў педагогікі і псіхалогіі. Валоданне тэарэтычнымі ведамі аб заканамернасцях развіцця, навучання і выхавання, аб прынцыпах, змесце, метадах, формах навучанння і выхавання дазволіць студэнтам ІІІ курса асэнсавана і кваліфікавана ажыццяўляць назіранні за вучэбна-выхаваўчым працэсам ва ўстановах адукацыі.

Мэтанакіраванае назіранне, аналіз вучэбна-выхаваўчага працэсу, вывучэнне педагагічнага вопыту дапамагаюць больш глыбока разабрацца ў складаных пытаннях педагагічнай тэорыі, садзейнічаюць развіццю педагагічнай назіральнасці. Акрамя таго, авалоданне методыкай назірання як адным са спосабаў навуковага даследавання істотна і для фарміравання даследніцкага падыходу да педагагічных з’яў, удасканалення якасцей творчай асобы.

## ЗМЕСТ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Азнаямленча-адаптацыйная педагагічная практыка ўключае:
1) знаёмства студэнтаў з канкрэтнымі ўмовамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ўстановы адукацыі; з асноўнымі кірункамі прафесійнай дзейнасці настаўнікаў;
2) знаёмства з арганізацыяй вучнёўскага самакіравання ва ўстанове адукацыі;
3) аналіз дзейнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, праца па абсталяванні кабінета беларускай мовы і літаратуры;
4) вывучэнне вучэбных праграм, падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры;



Репозиторий ВГУ

5) знаёмства з каляндарным і каляндарна-тэматычным планаваннем урокаў беларускай мовы і беларускай літаратуры;
6) назіранне за працай вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Студэнт замацоўваецца за адным класам. Практыканты наведваюць урокі ўсіх настаўнікаў у тых класах, за якімі яны замацаваны, спецыяльная ўвага ўдзяляецца ўрокам беларускай мовы і літаратуры і ншым дысцыплінам гуманітарнага цыклу лепшых педагогаў установы адукацыі, у якой праходзіць практыка.

Прыкладны змест дзейнасці студэнтаў у час вучэбнай азнаямленча-адаптацыйнай педагагічнай практыкі:

1. Комплекснае вывучэнне сістэмы вучэбна-выхаваўчай работы ў школе (ліцэі, гімназіі, каледжы) і вывучэнне асаблівасцей класа і асобных вучняў:

– гутарка з адміністрацыяй установы адукацыі, настаўнікамі, класнымі кіраўнікамі;
– знаёмства з планам работы ўстановы адукацыі;
– знаёмства з матэрыяльнай базай установы адукацыі;
– вывучэнне асабістых спраў вучняў, класных журналаў;
– назіранні за вучнямі падчас наведвання ўрокаў па розных прадметах і пазакласных мерапрыемстваў у замацаваным класе;
– гутаркі з вучнямі, бацькамі;
– пасіўны ўдзел у бацькоўскім сходзе;
– вывучэнне асобы і асаблівасцей працэсу выхавання і развіцця асобнага вучня.

2. Вучэбная работа па прадмеце:

– азнаямленне з абсталяваннем і афармленнем кабінета беларускай мовы і літаратуры;
– вывучэнне каляндарна-тэматычных і паўрочных планаў настаўніка-прадметніка, знаёмства з планам пазакласнай работы па прадмеце;
– наведванне і аналіз урокаў беларускай мовы і літаратуры;
– вывучэнне правіл (методыкі) арганізацыі ўрока гуманітарнага цыклу.

3. Пазакласная выхаваўчая работа:

– знаёмства з планам выхаваўчай работы навучальнай установы;
– вывучэнне плана работы класнага кіраўніка;
– наведванне і аналіз наведаных выхаваўчых мерапрыемстваў у замацаваным класе;
– вывучэнне асаблівасцей арганізацыі выхаваўчай працы па прадмеце;
– правядзенне выхаваўчага мерапрыемства па прадмеце.

4. Прафесійна-адаптацыйная дзейнасць студэнта-практыканта:

– дыягностыка ўзроўню развіцця вучнёўскага калектыву;
– характарыстыка асобы вучня;

Рэпазіторый ВДУ

– дапамога класнаму кіраўніку ў падрыхтоўцы разнастайных формаў пазакласных мерапрыемстваў;
– непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні аднаго выхаваўчага мерапрыемства;
– праверка вучнёўскіх сшыткаў па беларускай мове.
5. Аналіз і самааналіз вынікаў практыкі:
– абмеркаванне дзейнасці мікрагрупы студэнтаў-практыкантаў установы адукацыі, у якой праходзіла практыка;
– вядзенне аналітычных запісаў у дзённіку педагагічнай практыкі;
– самаацэнка ўзроўню сфарміраваных педагагічных уменняў;
– падрыхтоўка справаздачнай дакументацыі.

## НАВЕДВАННЕ І АНАЛІЗ УРОКАЎ І ПАЗАКЛАСНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

У час азнаямленчай практыкі групавы кіраўнік арганізуе наведванне студэнтамі ўрокаў настаўнікаў-славеснікаў з наступным абмеркаваннем урокаў, на якім настаўнікі расказваюць, якія існуюць патрабаванні да сучаснага ўрока, як быў падрыхтаваны ўрок, ажыццяўляюць аналіз сваёй сістэмы навучання і інш. У абмеркаванні ўрока актыўны ўдзел прымаюць групавы кіраўнік і студэнты-практыканты. Студэнты асэнсоўваюць крытэрыі ацэнкі ўрокаў, вызначаюць той ідэал урока, да якога павінен імкнуцца кожны настаўнік.

Асноўная мэта назірання на ўроку – заўважыць і асэнсаваць станоўчы вопыт у працы настаўніка, каб потым прымяніць яго ў працэсе актыўнай педагагічнай практыкі і ў далейшай прафесійнай дзейнасці.

Пры гэтым звяртаецца ўвага на:
– важнасць правільнага вызначэння мэты ўрока;
– выбар тыпу і структуры ўрока, метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэты ўрока, зместу праграмнага матэрыялу, асаблівасцей вучняў пэўнага класа і г. д.;
– разуменне навучання як адзінага працэсу, суб’ект-суб’ектнага характару ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў;
– захаванне прынцыпаў навучання, развіцця і выхавання на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

У час назіранняў студэнты робяць запісы па наступнай схеме:
1. Дата назірання, клас, месца ўрока ў раскладзе вучэбнага дня; прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка; колькасць вучняў, якія прысутнічаюць на ўроку.
2.Тэма ўрока. Месца ўрока ў агульнай сістэме ўрокаў па тэме (высвятляецца папярэдне).



Репозиторий ВГУ

3. Мэта і задачы ўрока (высвятляюцца ў настаўніка перад пачаткам ўрока).
4. Падрыхтаванасць да ўрока (афармленне дошкі, стан працоўных месцаў вучняў, падрыхтаванасць вучняў да ўрока), абсталяванне.
5. Пратакольны запіс урока з аналітычным каментарыем. Ажыццяўляецца па наступнай схеме: ход урока – аналітычны каментарый.

У адпаведнасці з вызначанымі ніжэй патрабаваннямі прапануецца разгорнуты або сціслы ***змест*** урока. Распаўсюджанай памылкай пры аналізе ўрока з’яўляецца толькі канстатацыя фактаў без аналітычнага каментарыю.

## АСНОЎНЫЯ ТЫПЫ І ВІДЫ АНАЛІЗУ ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***1. Комплексны аналіз.*** Урок разглядаецца ў адзінстве і ўзаемасувязі мэты, зместу, метадаў, формаў арганізацыі ўсіх аспектаў навучальных заняткаў – дыдактычнага, псіхалагічнага, выхаваўчага, метадычнага, арганізацыйнага.

***2. Аспектны аналіз урока*** прадугледжвае больш глыбокі разгляд пэўнага аспекту ўрока.

***Дыдактычны аналіз урока*** – аналіз урока, у якім даецца характарыстыка асноўных дыдактычных катэгорый: 1) пастаноўка мэты ўрока; 2)адпаведнасць дыдактычным прынцыпам навучання; 3) логіка вучэбнага матэрыялу і прымянення сродкаў навучання; 4) актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў; 5) арганізацыя самастойнай работы вучняў.

***Псіхалагічны аналіз урока*** ставіць за мэту вывучэнне псіхалагічнага клімату на ўроку, адносін паміж настаўнікам і вучнямі, пытанняў педагагічнага такту настаўніка, эмацыйнага настрою вучняў.

***Выхаваўчы аналіз урока*** ставіць за мэту вывучэнне ступені выхаваўчага ўздзеяння ўрока на вучняў.

***Метадычны аналіз урока*** ставіць за мэту вывучэнне дзейнасці настаўніка і вучняў на пэўных этапах урока.

***Аналіз арганізацыйнага аспекту ўрока*** ставіць за мэту вывучэнне прыёмаў арганізацыі заняткаў, выкарыстання нагляднасці на ўроку, ТСН, рацыянальнага выкарыстання часу на ўроку, вядзення настаўнікам дакументацыі.

***3. Сціслы аналіз*** праводзіцца з мэтай агульнай ацэнкі навукова-тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню (дасягненне мэты ўрока, вырашэнне пазнавальных задач, выкананне плану ўрока).

Репозиторий ВГУ

## СХЕМА АНАЛІЗУ ЎРОКА КАМБІНАВАНАЙ БУДОВЫ

**I. Мэта і месца ўрока**

**Мэта ўрока**

- Урок скіраваны на вывучэнне аспектаў мовы (фанетыкі, лексікі, граматыкі).
- Урок скіраваны на фарміраванне, развіццё, удасканаленне навыкаў і ўменняў вуснага (пісьмовага) маўлення.
- Урок падпарадкаваны комплексным мэтам.
- Урок утрымлівае адукацыйныя і выхаваўчыя мэты.
- Месца ўрока ў вучэбным працэсе
- Урок пачынае (працягвае, завяршае) тэму.
- Урок адпавядае (не адпавядае) праграме, плану.

**II. Структура ўрока**

**Арганізацыя ўрока**

- Настаўнік паведаміў (не паведаміў) задачы, тэму ўрока.
- Настаўнік выкарыстоўваў (не выкарыстоўваў) суразмоўніцтва з вучнямі.
- Настаўнік змог (не змог) стварыць творчую, дзелавую атмасферу, стварыць маўленчае асяроддзе .

**Праверка дамашняга задання**

- Настаўнік выкарыстоўваў франтальнае, індывідуальнае апытванне. Настаўнік выпраўляў (не выпраўляў) памылкі сам, далучаў да гэтай работы вучняў.
- Настаўнік ацэньваў (не ацэньваў) выкананую дома работу.

**Тлумачэнне новага матэрыялу**

- Настаўнік падаваў новы матэрыял у камунікатыўнай форме (праз тэксты, дыялогі, творчыя задачы).
- Семантызацыя моўных адзінак суправаджалася (не суправаджалася) указаннем на сферу іх выкарыстання.
- Выкарыстанне сродкаў нагляднасці, ТСН, падручніка, дошкі пры тлумачэнні новага матэрыялу.
- Настаўнік кантраляваў (не кантраляваў) першаснае замацаванне новага матэрыялу.

**Замацаванне новага матэрыялу**

- Настаўнік выкарыстоўваў моўныя, маўленчыя (сітуацыйныя) практыкаванні.

Настаўнік выкарыстоўваў рэпрадуктыўныя, прадуктыўныя праблемныя заданні. Якім заданням аддавалася перавага? Выкарыстанне тэксту для назірання і аналізу моўных адзінак (як сродак фарміравання маўленчых навыкаў і ўменняў; як узор для

Репозиторий ВГУ

пабудовы вучнямі выказванняў па аналогіі; як крыніца інфармацыі; як сродак кантролю). Работа з тэкстам прайшла эфектыўна (не эфектыўна). Змест тэксту зацікавіў (не зацікавіў) вучняў, з’явіўся (не з’явіўся) стымулам для абмеркавання, гутаркі, дыскусіі.

---

- Кантроль праводзіўся фармальна (нефармальна).
- Вучні могуць (не могуць) выкарыстоўваць вывучаны матэрыял у маўленні.

**Падвядзенне вынікаў урока**

- Настаўнік падводзіў (не падводзіў) вынікі ўрока, ствараў (не ствараў) стымул для далейшай працы.
- Настаўнік выкарыстоўваў (не выкарыстоўваў) дыферэнцыраваную ацэнку вучняў у залежнасці ад іх асобасных характарыстык.

**ІІІ. Формы работы на ўроку**

- Франтальная, групавая, работа ў парах, работа па ланцужку, індывідуальная.
- Вучань–настаўнік, вучань–вучань, вучань–кніга, вучань–дошка, вучань–малюнак, вучань–камп’ютар, вучань–вучні.

**IV. Размеркаванне часу на ўроку**

- Час размеркаваны ў адпаведнасці з этапамі ўрока (на пэўным этапе ўрока час зацягнуты).
- Часавыя прапорцыі: маўленне настаўніка – маўленне вучняў.
- Час выкарыстоўваўся эфектыўна (неэфектыўна).

**V. Настаўнік**

- Стварае (не стварае) творчую, дзелавую атмасферу ў класе.
- Мае (не мае) кантакту з класам.
- Добра (дрэнна) ведае сваіх вучняў.
- Тлумачыць матэрыял з улікам (без уліку) узроставых і псіхалагічных асаблівасцей вучняў.
- Маўленне настаўніка: узорнае, стылістычна карэктнае, выразнае.
- Настаўнік можа (не можа) кіраваць пазнавальнай дзейнасцю вучняў, рацыянальна арганізоўваць дзейнасць вучняў на ўроку.
- Настаўнік трымаецца ўпэўнена, паважае вучняў, добразычлівы з імі.

**VI. Вучні**

- Актыўныя, ініцыятыўныя, ахвотна адказваюць, не баяцца дапусціць памылку.
- Цікавяцца беларускай мовай, урокам.
- Падтрымліваюць настаўніка, паважаюць яго думку.



Репозиторий ВГУ

**Вывады**

У заключэнні аналізу ўрока робяцца агульныя вывады пра тое, ці дасягнуты мэты ўрока, у якой меры ўрок можа быць прызнаны эфектыўным, ці валодае настаўнік навыкамі падагагічнага суразмоўніцтва, што можна пажадаць настаўніку ў падрыхтоўцы і правядзенні ўрока беларускай мовы.

## ПАРАДЫ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПРЫ ВЫБАРЫ АПТЫМАЛЬНАГА ТЫПУ ЎРОКА

**1.** Улічваць пры планаванні ўрока індывідуальныя асаблівасці вучня і класнага калектыву.

**2.** Аптымальна планаваць задачы ўрока:

- фармуляваць задачы ўрока комплексна (адукацыйныя, развіццёвыя, задачы выхавання);
- канкрэтызаваць іх, улічваючы асаблівасці класа;
- прадумаць шляхі і спосабы рэалізацыі задач урока з дапамогай зместу, формаў, метадаў, сродкаў, умоў навучання і г.д.

**3.** Аптымальна будаваць змест урока. Улічваць патрабаванні праграмы, матэрыял падручніка, метадычныя рэкамендацыі:

- выдзеліць галоўнае, істотнае з пазіцыі пастаўленых вучэбна-выхаваўчых задач; выбраць найбольш рацыянальны варыянт логікі раскрыцця тэмы (індуктыўны ці дэдуктыўны);
- дапоўніць змест падручніка новымі навуковымі звесткамі (краязнаўчымі, прафарыентацыйнымі і інш.), прыкладамі, практыкаваннямі, заданнямі, якія развіваюць навыкі вучэбнай рабаты, пазнавальныя інтарэсы і здольнасці вучняў на аснове дыферэнцыраванага і індывідуальнага падыходу.

**4.** Выбіраць аптымальныя формы і метады навучання:

- прадумваць спалучэнне франтальнай, парнай, групавой, індывідуальнай формаў работы;
- улічваць пры выбары метадаў навучання моцныя і слабыя бакі кожнага з іх, арыентуючыся на пастаўленыя задачы, змест урока, асаблівасці вучняў, узровень іх падрыхтаванасці.

**5.** Забяспечваць аптымальныя ўмовы для правядзення ўрока:

- вучэбна-матэрыяльныя (наяўнасць неабходнага для ўрока абсталявання);
- школьна-гігіенічныя (паветраны і светлавы рэжым, размяшчэнне вучняў у класе, прафілактыка стамляемасці вучняў і г.д.);

- маральна-псіхалагічныя (педагагічны такт і аптымізм, адносіны з класам, псіхалагічны клімат у класе).

**6.** Аптымальна выбраць тып і вызначыць структуру ўрока, прадумаць паслядоўнасць элементаў урока і размеркаваць час.
**7.** Выбраць аптымальны аб’ём і ацаніць складанасць дамашняга задання, дыферэнцыраваць яго з улікам рэальных вучэбных магчымасцей вучняў.
**8.** Мэтэнакіравана праводзіць работу па папярэджанні памылак у вучняў.

Абмеркаванне ўрока адбываецца непасрэдна пасля яго заканчэння. Пратакольны запіс урока з аналітычным каментарыем і запісы, зробленыя ўчас абмеркавання ўрока, выкарыстоўваюцца студэнтамі на практычных занятках па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры.

## МЕТОДЫКА ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫХАВАЎЧАГА МЕРАПРЫЕМСТВА

Арганізацыя выхаваўчага мерапрымства ўключае тры этапы: падрыхтоўку, правядзенне мерапрыемства і абмеркаванне яго вынікаў.

Этап **падрыхтоўкі** ўключае:

- метадычную падрыхтоўку настаўніка:

– вызначэнне выхаваўчых задач на дадзены перыяд работы ў калектыве (з улікам узроўню выхаванасці);
– вылучэнне вядучай мэты выхаваўчага мерапрыемства;
– падбор метадаў і прыёмаў;
– вызначэнне арганізацыйнай формы;
– выбар метадаў прыцягнення вучняў;
– прадумванне дыдактычнага і метадычнага матэрыялу (карціны, плакаты, музычнае афармленне);
– запрашэнне адміністрацыі, гасцей.

- тэарэтычную падрыхтоўку:

– вывучэнне адпаведнай літаратуры;
– вызначэнне ўласнай пазіцыі;
– распрацоўку адпаведных тэзісаў і іх аргументаў (тэзіс – аргумент – ілюстрацыя);
– вычляненне найбольш важных пытанняў.

- арганізацыйную працу:

– прадугледжвае інфармаванне аб мерапрыемстве,
– прыцягненне вучняў да падрыхтоўкі і правядзення.

На этапе **правядзення** мерапрыемства настаўнік дэманструе свае арганізатарскія здольнасці, курыруе працэс падрыхтоўкі асобных этапаў вучнямі, аказвае дапамогу і падтрымку.

Рэпазіторый ВДУ

Прыкладны сцэнарны план:
1. Тэматычная задума.
2. Педагагічная мэта.
3. Магчымая педагагічная выніковасць.
4. Характарыстыка аўдыторыі.
5. Экспазіцыя.
6. Завязка (пачатак дзеяння).
7. Развіццё дзеяння (падзейны рад).
8. Кульмінацыя.
9. Развязка.
10. Фінал.

Пры правядзенні выхаваўчага, культурна-творчага мерапрыемства важна ўлічваць яго нетрадыцыйнасць і ступень навізны, кампазіцыйную цэласнасць, лагічнасць і завершанасць сцэнарыя, даступнасць формы правядзення, арыгінальнасць, узроставыя і індывідуальныя асаблівасці ўдзельнікаў.

**Асэнсаванне** вынікаў праведзенага мерапрыемства з'яўляецца важным этапам працы, які можа ажыццяўляцца на класным сходзе ў форме *гутаркі-апытання*. Дадзены этап можа быць рэалізаваны і шляхам *анкетавання* (“Што спадабалася і чаму? Што не спадабалася і чаму?”). Завяршэннем этапа асэнсавання вынікаў павінны зрабіцца калектыўныя высновы аб тым, што неабходна ўлічыць у працэсе далейшай падрыхтоўкі мерапрыемстваў.

Калектыўная рэфлексія адлюстроўваецца ў канспекце выхаваўчага мерапрыемства. Канспект выхаваўчага мерапрыемства, падпісаны настаўнікам, здаецца на праверку кіраўніку па педагогіцы, а потым – групавому кіраўніку практыкі.

Патрабаванні да афармлення: папера фармату А4, камп'ютарны набор ці рукапісны варыянт, наяўнасць тытульнага ліста, спісу выкарыстаных крыніц.

Прыкладны змест метадычнага каментарыю:
1. Калі, дзе і з вучнямі якога класа праводзілася выхаваўчае мерапрыемства?
2. Назва мерапрыемства, яго задачы (навучальныя, развіццёвыя, выхаваўчыя), у сувязі з чым было праведзена (у сувязі з запланаванасцю, з улікам інтарэсаў вучняў класа, у сувязі са знамянальнай датай і г. д.).
3. Што ўяўляў сабой падрыхтоўчы этап правядзення выхаваўчага мерапрыемства?
4. Якое абсталяванне выкарыстоўвалася ў працэсе яго правядзення?
5. Сцэнарый мерапрыемства.
6. Як, калі і дзе праходзіў этап абмеркавання вынікаў мерапрыемства? Што паказала калектыўная рэфлексія?



Репозиторий ВГУ

7. Вывады практыканта аб ступені задаволенасці праведзеным мерапрыемствам, аналіз прычын выяўленых недахопаў, недапрацовак; развагі аб карыснасці дадзенага віду практычнай дзейнасці у школе (уплывае на развіццё пэўных педагагічных здольнасцяў, якасцяў асобы, развівае канкрэтныя педагагічныя ўменні і г. д.).

## СХЕМА АНАЛІЗУ ВЫХАВАЎЧАГА МЕРАПРЫЕМСТВА

1. Агульныя звесткі: дата, месца правядзення, вучэбная група і яе склад (клас, клуб, аматарскае аб'яднанне, гурток і г. д.).

*Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога настаўніка, які праводзіць мерапрыемства.*

2. Псіхолага-педагагічнае абгрунтаванне праведзенага мерапрыемства: назва, мэта і мерапрыемства, тэма і актуальнасць.

*Кім, у сувязі з чым і калі яно было прапанавана; адпаведнасць інтарэсам і ўзроўню развіцця калектыву, узроставым і індывідуальным асаблівасцям вучняў.*

3. Апісанне падрыхтоўчага этапа.

*Арганізатары і выканаўцы.*

*Размеркаванне даручэнняў. Роля ініцыятыўнай групы і педагога.*

*Ці ўдалося ў падрыхтоўчы перыяд выклікаць у вучняў цікавасць, разуменне значнасці далейшай працы, сфарміраваць да яе станоўчае эмацыянальнае стаўленне?*

4. Ход мерапрыемства.

*Своечасовы пачатак, развіццё дзеяння, кульмінацыя, развязка, завяршэнне.*

*Працягласць мерапрыемства.*

5. Змест і методыка правядзення.

*Нетрадыцыйнасць і ступень навізны мерапрыемства, даступнасць формы правядзення, арыгінальнасць, сувязь з сучаснымі праблемамі, спалучэнне калектыўнай і індывідуальнай працы, эмацыйнасць і актыўнасць удзельнікаў, ступень зладжанасці і ўзаемадзеяння, рэакцыя гледачоў, прадуктыўнасць і разнастайнасць метадаў, прыёмаў правядзення мерапрыемства.*

*Афармленне памяшкання (сцэны, залы і г. д.), абсталяванне.*

6. Педагагічная выніковасць.

*Якія выхаваўчыя задачы былі вырашаны (поўнасцю, часткова), а якія – не?*

*Характар узаемадачыненняў паміж педагогам-арганізатарам і ўдзельнікамі мерапрыемства, паміж самімі вучнямі, паміж гледачамі і ўдзельнікамі і г. д.*

7. Агульная ацэнка, вывады, прапановы і пажаданні па падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні выхаваўчага мерапрыемства.



Рэпазіторый ВДУ

У якасці **справаздачнай дакументацыі** студэнты здаюць групавому кіраўніку:

- дзённік з фіксацыяй паўсядзённай работы;
- пратакольныя запісы наведаных урокаў;
- аналіз урокаў беларускай мовы і беларускай літаратуры (згодна з праграмай практыка);
- аналіз выхаваўчага мерапрыемства;
- змест выкананых заданняў вучэбнай азнаямленчай і азнаямленча-адаптацыйнай практыкі (згодна з праграмай практыкі).

Репозиторий ВГУ

## ВЫТВОРЧАЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА
### ФУНКЦЫІ СТУДЭНТАЎ

У час праходжання вытворчай практыкі студэнт-практыкант:

• падпарадкоўваецца правілам унутранага распарадку ўстановы адукацыі, распараджэнням адміністрацыі, настаўніка-прадметніка і кіраўнікоў практыкі;

• у адпаведнасці з праграмай узгадняе з настаўнікам-прадметнікам і здае групавому кіраўніку-метадысту на зацвярджэнне графік заліковых і адкрытых урокаў па беларускай мове і літаратуры, у тым ліку пазакласных і выхаваўчых мерапрыемстваў, на ўвесь перыяд практыкі;

• своечасова выконвае ўсе віды працы, прадугледжаныя вучэбнай праграмай па педагагічнай практыцы: наведвае ўрокі славеснікаў і іншых настаўнікаў-прадметнікаў; старанна рыхтуецца да правядзення кожнага свайго ўрока, а таксама запланаваных пазакласных і выхаваўчых мерапрыемстваў; выконвае заданні па псіхалогіі і педагогіцы; штодзённа адлюстроўвае ў дзённіку па педпрактыцы назіранні за вучэбна-выхаваўчай працай у школе, а таксама аналізуе вынікі сваіх назіранняў;

• дае распрацаваныя планы-канспекты ўрокаў для праверкі і зацвярджэння настаўніку-прадметніку ці групавому кіраўніку за два дні да правядзення ўрока;

• самастойна рыхтуе дыдактычны і нагляды матэрыял для правядзення ўрокаў, прымае ўдзел у афармленні вучэбнага кабінета па беларускай мове і літаратуры;

• вывучае перадавы вопыт настаўнікаў-славеснікаў, укараняе сучасныя метады, прыёмы, тэхналогіі навучання ў сваю практычную дзейнасць і пастаянна ўдасканальвае метадычную падрыхтоўку;

• абавязкова наведвае заліковыя і адкрытыя ўрокі беларускай мовы і літаратуры сваіх аднакурснікаў, а таксама актыўна ўдзельнічае ў іх абмеркаванні;

• мае права па ўсіх пытаннях, якія ўзніклі ў ходзе педагагічнай практыкі, звяртацца да ўніверсітэцкіх кіраўнікоў практыкі, адміністрацыі ўстановы адукацыі і настаўнікаў, уносіць прапановы па ўдасканаленні навучальна-выхаваўчага працэсу, арганізацыі практыкі, прымаць удзел у педсаветах і нарадах, карыстацца бібліятэкай, метадычнымі дапаможнікамі і вучэбнымі кабінетамі;

• пры змене ў раскладзе ўрокаў своечасова даводзіць да ведама групавога кіраўніка, настаўніка і студэнтаў сваёй групы;

• афармляе ў адпаведнасці з патрабаваннямі справаздачную дакументацыю і своечасова здае яе на праверку групавому кіраўніку;

• прымае актыўны ўдзел у правядзенні выніковай канферэнцыі па педпрактыцы;



Репозиторий ВГУ

• факультэцкім ці групавым кіраўніком прызначаецца староста ў студэнцкай групе на ўвесь перыяд практыкі;

• староста групы складае зводны графік усіх заліковых і адкрытых урокаў студэнтаў сваёй школы на ўвесь перыяд практыкі і здае яго групавому кіраўніку ў канцы першага тыдня практыкі.

У выпадку невыканання патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да студэнтаў-практыкантаў, студэнт можа быць адхілены ад праходжання практыкі.

## АСНОЎНЫЯ ВЕДЫ, УМЕННІ І НАВЫКІ, неабходныя студэнтам пры праходжанні вытворчай педагагічнай практыкі:

**Студэнт-практыкант павінен ведаць:**

- змест школьнага курса беларускай мовы;
- умовы і формы педагагічнай камунікацыі;
- асаблівасці дзяцей розных узроставых груп;
- асновы арганізацыі вопытна-эксперыментальнай і навукова-даследчай працы ў галіне спецыялізацыі;
- агульнадыдактычныя, уласнаметадычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы выкладання беларускай мовы;
- метады і формы арганізацыі вучэбнага працэсу;
- методыку выкладання раздзелаў курса беларускай мовы, развіцця маўлення, арганізацыі факультатываў і пазакласных мерапрыемстваў.

**Студэнты павінны валодаць наступнымі ўменнямі**:

- планавання вучэбнага матэрыялу;
- аналізаваць дзеючыя праграмы і падручнікі;
- будаваць ўрокі рознага тыпу;
- распрацоўваць і абгрунтоўваць выбар наглядных дапаможнікаў, тэхнічных сродкаў;
- правяраць і ацэньваць пісьмовыя работы і іх аналізаваць;
- ацэньваць вусныя адказы вучняў.

**Студэнт-практыкант павінен мець уяўленне:**

- аб сістэме ведаў і заканамернасцях цэласнага падагагічнага працэсу;
- аб заканамернасцях, тыповых з'явах і пераходных выпадках моўных з'яў;
- аб сучасных напрамках і праблемах методыкі выкладання мовы;
- аб сучасных псіхолага-педагагічных тэхналогіях, тэхналогіях развіццёвага навучання.

Репозиторий ВГУ

**Студэнт-практыкант павінен валодаць:**

- асноўнымі метадамі вывучэння моў;
- living рознымі прыёмамі інтэрпрэтацыі тэкстаў рознага тыпу, стылю, жанру;
- методыкамі праграмнай творчасці па беларускай мове з улікам асаблівасцей кантынгенту навучэнцаў, нацыянальнага складу класа;
- сістэмай ведаў аб заканамернасцях камунікацыі і спосабах кіравання індывідам і групай.

**Студэнт-практыкант павінен выкарыстоўваць:**

- набытыя навыкі і ўменні выкарыстання наглядных і тэхнічных сродкаў навучання;
- асноўныя інфармацыйныя тэхналогіі ў навучанні роднай мове.

## ЗМЕСТ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

**Вучэбная работа па прадмеце:**

– распрацоўка планаў-канспектаў урокаў, прадастаўленне іх на зацвярджэнне настаўніку-прадметніку ці/і групавому кіраўніку;

– падбор, падрыхтоўка дыдактычных матэрыялаў, наглядных дапаможнікаў, падрыхтоўка тэхнічных сродкаў навучання да ўрока;

– падрыхтоўка і правядзенне пробных урокаў беларускай мовы і літаратуры;

– наведванне і аналіз урокаў настаўнікаў і студэнтаў-практыкантаў, удзел у абмеркаванні ўрокаў;

– падрыхтоўка і правядзенне заліковых урокаў.

**Пазакласная праца па прадмеце:**

– падрыхтоўка і правядзенне асобных відаў пазакласнай працы па прадмеце;

– сістэматычная індывідуальная работа па прадмеце з асобнымі вучнямі;

–дапамога настаўніку ў афармленні кабінета беларускай мовы і літаратуры;

– наведванне і аналіз пазакласных мерапрыемстваў па прадмеце ў межах агульнага плана і мерапрыемстваў, што праводзяцца студэнтамі-практыкантамі.

**Выхаваўчая праца:**

– удзел у бягучай выхаваўчай працы, якая праводзіцца класным кіраўніком;

– падрыхтоўка і правядзенне пазакласных выхаваўчых мерапрыемстваў;



Репозиторий ВГУ

– наведванне і аналіз пазакласных выхаваўчых мерапрыемстваў, што праводзяцца студэнтамі-практыкантамі;

– аналіз псіхолага-педагагічных прычын слабой паспяховасці і недысцыплінаванасці вучняў ці іх неадэкватных паводзін, планаванне і ажыццяўленнне адпаведнай прэвентыўнай і карэкцыйнай працы (пры неабходнасці);

– распрацоўка зместу і методыкі правядзення псіхолага-педагагічных кансультацый для школьнікаў;

– удзел у працы з бацькамі (наведванне вучняў дома, правядзенне індывідуальных гутарак з бацькамі, прысутнасць на бацькоўскіх сходах, апякунскіх саветах і інш.).

**Метадычная і навукова-даследчая праца:**

– вывучэнне неабходнай навуковай, вучэбнай і навукова-метадычнай літаратуры;

– азнаямленне з планам працы метадычнага аб'яднання (кафедры) настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, семінараў класных кіраўнікоў, працай псіхалагічнай службы;

– удзел у семінарах (кансультацыях), якія праводзяцца кіраўнікамі педагагічнай практыкі на працягу ўсяго тэрміну;

– аналіз уласнай педагагічнай дзейнасці і вядзенне педагагічнага дзённіка;

– вызначэнне тэмы, распрацоўка плана, вызначэнне методыкі даследавання;

– збор матэрыялаў для навукова-даследчых праектаў па педагогіцы, псіхалогіі;

– удзел у працы вучнёўскіх даследніцкіх гурткоў, кіраўніцтва вучнёўскімі навуковымі працамі.

На пачатку вытворчай педагагічнай практыкі студэнты праводзяць пробныя ўрокі. Канспекты пробных урокаў папярэдне абмяркоўваюцца з настаўнікам, які дае допуск да ўрока. На пробных уроках (як і на працягу ўсяго тэрміну педагагічнай практыкі) прысутнічаюць усе студэнты групы, пасля ўрокаў праводзіцца аналіз, у час якога спачатку з самааналізам выступае студэнт, які праводзіў урок, затым – аднакурснікі, якія прысутнічалі на ўроку, і ў канцы настаўнік-метадыст і/ці групавы кіраўнік. Усе праведзеныя і наведаныя ўрокі фіксуюцца ў дзённіку.

У канцы другога этапа практыкі студэнты складаюць графік заліковых урокаў. Практыканты праводзяць заліковыя ўрокі, якія аналізуюцца аднакурснікамі, настаўнікам-метадыстам, групавым кіраўніком, выкладчыкамі кафедры педагогікі і псіхалогіі і ацэньваюцца.

На працягу практыкі студэнты выконваюць функцыі класнага кіраўніка, удзельнічаюць ў запланаваных выхаваўчых



Репозиторий ВГУ

мерапрыемствах, вывучаюць клас і асобу вучня для падрыхтоўкі псіхолага-педагагічнай характарыстыкі.

## КІРАЎНІЦТВА ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКАЙ

***Факультэцкі кіраўнік*:**

– наладжвае сувязь з установамі адукацыі, што з'яўляюцца базавымі для правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў-філолагаў;
– рыхтуе праект загаду аб размеркаванні студэнтаў па базавых вучэбных установах, забяспечвае арганізацыю практыкі;
– арганізуе і праводзіць установачную і выніковую канферэнцыі на факультэце;
– выбарачна наведвае ўрокі, што праводзяцца студэнтамі;
– арганізуе падвядзенне вынікаў практыкі;
– забяспечвае своечасовае афармленне агульнай экзаменацыйнай ведамасці па педпрактыцы, дакументаў на аплату працы настаўнікаў і адміністрацый устаноў, на базе якіх праходзіла практыка;
– складае справаздачу па выніках вытворчай практыкі.

***Групавы кіраўнік*:**

– арганізуе ўдзел студэнтаў у выніковай канферэнцыі па педагагічнай практыцы;
– складае агульны графік правядзення студэнтамі ўрокаў і здае яго факультэцкаму кіраўніку;
– кансультуе студэнтаў пры падрыхтоўцы да ўрокаў, правярае і зацвярджае (дапускае да правядзення) канспекты урокаў;
– прысутнічае на ўроках, якія праводзяцца студэнтамі, арганізуе іх калектыўнае абмеркаванне;
– ацэньвае вучэбна-выхаваўчую работу пратыкантаў па спецыяльнасці;
– правярае справаздачную дакументацыю студэнтаў (дзённік, канспекты ўрокаў, справаздачу), выстаўляе адзнакі за праведзеныя ўрокі, за аналіз урокаў;
– інфармуе факультэцкага кіраўніка аб ходзе педагагічнай практыкі;
– рыхтуе дакументацыю на аплату працы настаўнікаў і адміністрацыі базавых устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

***Кіраўнік па педагогіцы*:**

– прымае ўдзел ва ўстановачнай і выніковай канферэнцыях па педагагічнай практыцы;
– кансультуе студэнтаў пры падрыхтоўцы да правядзення пазакласных мерапрыемстваў, зацвярджае канспекты выхаваўчых мерапрыемстваў;
– прысутнічае на выхаваўчых мерапрыемствах, якія праводзяць студэнты, арганізуе калектыўнае абмеркаванне мерапрыемстваў, ацэньвае іх;



Рэпазіторый ВДУ

– выбарачна наведвае ўрокі студэнтаў, удзельнічае ў аналізе і ацэньванні гэтых урокаў;
– кансультуе студэнтаў па педагагічных пытаннях, што ўзнікаюць падчас практыкі;
– правярае і ацэньвае справаздачную дакументацыю студэнтаў па педагагічнай рабоце.

***Кіраўнік па псіхалогіі*:**
– прымае ўдзел ва ўстановачнай і выніковай канферэнцыях па педагагічнай практыцы;
– праводзіць індывідуальныя і групавыя кансультацыі для студэнтаў па пытаннях псіхолага-педагагічнага тэсціравання і складання псіхолага-педагагічнай характарыстыкі класа ці вучня;
– кансультуе студэнтаў па псіхолага-педагагічных пытаннях, што ўзнікаюць у студэнтаў па ходзе практыкі;
– правярае і ацэньвае псіхалагічныя даследаванні.

***Прадстаўнік адміністрацыі*** ўстановы адукацыі (дырэктар, завуч):
– забяспечвае ўмовы для правядзення педагагічнай практыкі, праводзіць адпаведную працу з педагагічным калектывам, тэхнічным персаналам і вучнямі;
– знаёміць студэнтаў з пастаноўкай вучэбна-выхаваўчай працы, складам педагогаў, дакументацыяй, вучэбна-матэрыяльнай базай, працай педагагічнага савета, метадычных аб’яднанняў і інш.;
– сумесна з групавым кіраўніком размяркоўвае студэнтаў па класах;
– выбарачна наведвае ўрокі і пазакласныя заняткі практыкантаў, прымае ўдзел у іх абмеркаванні і выстаўленні адзнак;
– праводзіць нараду па пытаннях педпрактыкі на яе пачатку і ў канцы.

***Настаўнік-прадметнік:***
– знаёміць замацаваных да яго студэнтаў з планам вучэбна-выхаваўчай работы, праводзіць адкрытыя ўрокі і пазакласныя мерапрыемствы па прадмеце, арганізуе іх абмеркаванне;
– сумесна з групавым кіраўніком вызначае тэмы ўрокаў;
– кансультуе студэнтаў пры іх падрыхтоўцы да правядзення ўрокаў, дапускае да правядзення (зацвярджае) канспекты будучых урокаў;
– аказвае дапамогу студэнтам у падрыхтоўцы і правядзенні факультатыўных заняткаў, пазакласнай працы па прадмеце;
– наведвае, аналізуе і ацэньвае ўсе студэнцкія ўрокі і пазакласныя заняткі па прадмеце;
– аказвае дапамогу практыкантам у правядзенні індывідуальных заняткаў з вучнямі, пры праверцы сшыткаў і інш.

***Класны кіраўнік*:**
– знаёміць студэнтаў з вучнямі класа, з іх асабовымі справамі, паспяховасцю, наведваннем вучняў, з асноўнымі выхаваўчымі



Репозиторий ВГУ

задачамі і планам выхаваўчай працы, праводзіць адкрытыя пазакласныя выхаваўчыя мерапрыемствы;
– дапамагае студэнтам вызначыць выхаваўчыя задачы, кансультуе практыкантаў пры складанні плана выхаваўчай працы, кантралюе выкананне гэтага плана;
– дапамагае студэнтам у правядзенні бягучай выхаваўчай працы з вучнямі;
– прысутнічае на пазакласных мерапрыемствах, што праводзяцца студэнтамі, удзельнічае ў абмеркаванні, ацэньвае праведзенае пазакласнае мерапрыемства;
– удзельнічае ў нарадах, якія праводзяцца групавым кіраўніком.

Прыкладнае размеркаванне дзейнасці студэнтаў з тэрмінам практыкі 12 тыдняў спец. “Беларуская філалогія” (1 верасня – 27 лістапада) на працягу вытворчай педагагічнай практыкі адлюстравана ў табліцы.

*Табліца* – Прыкладнае размеркаванне дзейнасці студэнтаў з тэрмінам практыкі 12 тыдняў на працягу вытворчай педагагічнай практыкі

| Дата, тэрмін | Дзейнасць студэнтаў | Змест работы факультэцкага кіраўніка практыкі, метадыстаў |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| | | Падбор устаноў адукацыі ў якасці баз практыкі, узгадненне з адміністрацыяй устаноў адукацыі тэрмінаў практыкі, замацаванне настаўнікаў за практыкантамі. Падрыхтоўка праекта загада па педпрактыцы, складанне плана правядзення педпрактыкі |
| | | Правядзенне ўстановачнай канферэнцыі. |
| 1 тыдзень | Азнаямленне са школай, класамі, у якіх будуць даваць урокі і працаваць у якасці памочніка класнага кіраўніка, з аргані-зацыяй вучэбнай і выхаваўчай работы з вучнямі, з метадамі і прынцыпамі работы настаўнікаў школы, дакументацыяй, планамі. Складанне індывідуальнага каляндарнага плана-графіка работы на перыяд практыкі. | Праводзяць установачную канферэнцыю ў школе, знаёмяць з адміністрацыяй, настаўнікамі, размяркоўваюць па класах. Складаюць план кансультацый.<br><br>Ажыцяўляюць бягучы кантроль. Знаёмяцца з індывідуальнымі планамі і зацвярджаюць іх. |



Репозиторий БГУ

| | | |
|---|---|---|
| 2 - 3 тыдзень | Тэарэтычная і метадычная падрыхтоўка пробных урокаў (вывучэнне праграм, падручнікаў, метадычных дапаможнікаў, азнаямленне з планамі настаўнікаў).<br>Правядзенне пробных урокаў. | Аказваюць метадычную дапамогу у падрыхтоўцы пробных урокаў. |
| 4 - 5 тыдзень | Правядзенне пробных урокаў (падпісвае план і аналізуе ўрок настаўнік).<br>Узаеманаведванне ўрокаў (абавязкова адзначаць у дзённіку).<br>Падрыхтоўка да заліковых урокаў.<br>Выхаваўчая і арганізацыйная работа ў класным калектыве (гутарка з вучнямі, праверка дзённікаў і інш.). | Праводзяць гутарку з настаўнікамі і студэнтамі з мэтай перспектыўнага планавання, індывідуальных і групавых кансультацый, ажыццяўляюць бягучы кантроль. |
| 6-11 тыдзень | Правядзенне заліковых урокаў: спецыялізацыі 1 – 21 05 01 01 “Мовазнаўства”, 1 – 21 05 01 02 “Літаратуразнаўства”, 1 – 21 05 02 08 “Руская мова і літаратура” – 8 урокаў па беларускай літаратуры, 8 урокаў па беларускай мове; спецыялізацыя 1 – 21 05 01 07 “Літаратурная работа ў газетах і часопісах” – 6 урокаў па беларускай літаратуры і 6 урокаў па беларускай мове.<br>(План падпісвае настаўнік і метадыст за тры дні да правядзення ўрока).<br>Выкананне заданняў па педагогіцы, псіхалогіі.<br>Работа ў якасці памочніка класнага кіраўніка, абавязковае наведванне ўрокаў калег, іх аналіз. | Аказваюць метадычную дапамогу ў падрыхтоўцы да ўрокаў. Наведваюць і аналізуюць заліковыя урокі (разам з настаўнікам і свабодным ад ўрокаў студэнтам).<br>Кансультуюць па афармленні дакументацыі, бягучы кантроль.<br>Дапамагаюць прааналізаваць недахопы, даюць рэкамендацыі па іх выпраўленні.<br>Гутараць з адміністрацыяй, праводзяць выніковую канферэнцыю у школе. |
| 12 тыдзень | Афармленне дакументацыі. Пасля заканчэння педпрактыкі студэнты здаюць групавому кіраўніку да 25 лістапада наступныя дакументы:<br>а) індывідуальны план работы з адзнакамі за заліковыя ўрокі і | Пасля заканчэння педпрактыкі аналізуюць справаздачную дакументацыю, выстаўляюць адзнакі разам з настаўнікамі і прадстаўнікамі іншых кафедр, складаюць справаздачу аб практыцы і здаюць яе |

Репозиторий ВГУ

| | | |
|---|---|---|
| | пазакласныя мерапрыемствы;<br>б) дзённік педагагічнай практыкі;<br>в) справаздачу аб педпрактыцы па спецыяльных прадметах;<br>г) поўны аналіз наведаных урокаў па мове і літаратуры, 20 экспрэс-аналізаў наведаных урокаў;<br>д) планы-канспекты заліковых урокаў па беларускай мове і літаратуры;<br>е) характарыстыку за подпісам дырэктара установы адукацыі (тыя, хто праходзіць практыку па месцы жыхарства);<br>ж) метадыстам па педагогіцы і псіхалогіі заданні па педагогіцы і псіхалогіі. | факультэцкаму кіраўніку да 27 лістапада 2012 г.:<br>а) накіраванне і справаздачу аб ходзе практыкі ў замацаванай установе адукацыі;<br>б) зводку адзнак студэнтаў за педпрактыку;<br>в) дакументы на аплату настаўнікам, класным кіраўнікам, адміністрацыі школы;<br>г) лепшыя ўзоры справаздачнай дакументацыі студэнтаў. |
| | Правядзенне заключнай канферэнцыі. | |

Репозиторий ВГУ

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

За тры дні да заканчэння практыкі студэнты здаюць групаваму кіраўніку неабходную дакументацыю. Пасля завяршэння педагагічнай практыкі праводзіцца выніковая канферэнцыя.

Выніковая адзнака за педагагічную практыку выстаўляецца агульным кіраўніком практыкі на аснове адзнак, выстаўленых у ведамасці групавым кіраўніком, аналізу справаздачнай дакументацыі студэнта і ўдзелу студэнта ў выніковай канферэнцыі.

### СПРАВАЗДАЧНАЯ ДАКУМЕНТАЦЫЯ ПА ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ

Дакументацыя, якую здае студэнт-практыкант дзённай формы навучання групаваму кіраўніку:

1) педагагічны дзённік (прад'яўляецца групаваму кіраўніку і вяртаецца студэнту пасля праверкі), у якім акрамя штодзённага зместу дзейнасці змешчана 20 экспрэс-аналізаў наведаных урокаў;
2) поўны аналіз 2 наведаных урокаў па мове і літаратуры;
3) накіраванне і справаздача аб праведзенай працы;
4) канспекты заліковых урокаў па беларускай мове і літаратуры;
5) графік з адзнакамі за праведзеныя ўрокі;
6) канспект выхаваўчага мерапрыемства з адзнакай, выстаўленай выкладчыкам кафедры педагогікі;
7) адзнакі за педагагічнае і псіхалагічнае даследаванні (за подпісам выкладчыкаў-метадыстаў па педагогіцы і псіхалогіі).

**Студэнты завочнай формы навучання**, якія праходзяць вытворчую педагагічную практыку па месцы жыхарства, прадстаўляюць:

1) накіраванне і водзыў-характарыстыку з рэкамендуемай адзнакай;
2) справаздачу аб праведзенай рабоце;
3) канспекты заліковых урокаў за подпісам завуча ці настаўніка-метадыста;
4) выпіску з пратакола абмеркавання гэтых урокаў (з адзнакай);
5) канспект выхаваўчага мерапрыемства па прадмеце;
6) адзнакі за педагагічнае і псіхалагічнае даследаванні (за подпісам выкладчыкаў-метадыстаў па педагогіцы і псіхалогіі).

Дакументацыя, якую здае на кафедру групавы кіраўнік:

1) накіраванні і справаздачы студэнтаў;
2) ведамасць з адзнакамі за вучэбную работу, аналіз урокаў, выхаваўчую, пазакласную працу па прадмеце;
3) дакументацыя для аплаты работы адміністрацыі школ, настаўнікаў ікласных кіраўнікоў.

Репозиторий ВГУ

**ДАДАТАК**

# УЗОР АФАРМЛЕННЯ ДЗЁННІКА ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

**Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”**

**ДЗЁННІК ПРАКТЫКІ**

______________________________________________________________

*(Прозвішча, імя, імя па бацьку практыканта)*

Факультэт ______________________________________________________

Спецыяльнасць__________________________________________________

Месца праходжання практыкі ______________________________________

______________________________________________________________

Кіраўнік практыкі ад універсітэта___________________________________

______________________________________________________________

## Улік выкананай работы

| Дата | Кароткі аналіз выкананай работы | Адзнака кіраўніка практыкі |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

Репозиторий ВГУ

**Прыкладны ўзор афармлення заданняў**
**па азнаямленча-адаптацыйнай практыцы**
(распрацавала студэнтка 31 групы ФБФК
Максіменка Таццяна Уладзіміраўна)

**Заданне 1.** Знаёмства з установай адукцыі

УА "Сярэдняй школа № 45 г Віцебска"
Колькасць вучняў у школе – 1580, колькасць настаўнікаў – 136.
Дырэктар школы – Аўтухова Таццяна Анатольеўна.
Намеснікі дырэктара па вучэбнай рабоце – Куракова Марына Русланаўна, Прэйс Кацярына Іванаўна, па выхаваўчай рабоце – Кузубава Надзея Мікалаеўна, Бувалка Ігар Уладзіміравіч.

5 "Б" клас, класны кіраўнік – Новікава Алеся Юр'еўна.

**Заданне 2.**
*Расклад званкоў*

1. 8.00 – 8.45
2. 8.55 – 9.40
3. 10.00 – 10.45
4. 11.05 – 11.50
5. 12.05 – 12.50
6. 13.00 – 13.45

*Расклад урокаў*

Панядзелак
1. Матэматыка
2. Замежная мова
3. Руская літаратура
4. Чалавек і свет

Аўторак
1. Руская мова
2. Беларуская літаратура
3. Матэматыка
4. Беларуская мова

Серада
1. Беларуская мова
2. Замежная мова
3. Беларуская літаратура
4. Руская мова
5. Матэматыка

Чацвер
1. Гісторыя
2. Матэматыка
3. Руская літаратура
4. Руская мова
5. Беларуская мова

Пятніца
1. Працоўнае навучанне
2. Гісторыя
3. Замежная мова
4. Выяўленчае мастацтва
5. Матэматыка



Репозиторий ВГУ

## Заданне 3

| *Кірункі дзейнасці* | *Змест і формы дзейнасці* |
|---|---|
| **Вучэбна-выхаваўчая работа** | 1. Фарміраванне патрыятызму і грамадзянскасці навучэнцаў<br>2. Прапаганда здаровага ладу жыцця |
| **Метадычная работа** | 1. Фаміраванне ўласнага “партфоліа”<br>2. Павышэнне ўзроўня самаадукацыі<br>3. Азнаямленне з новымі вучэбна-метадычнымі дакументамі |
| **Работа з бацькамі** | 1. Размовы з бацькамі<br>2. Бацькоўскі сход<br>3. Наведванне сямей дома<br>4. Размовы па атэстацыі<br>5. “Бацькоўская гасціная” |
| **Грамадская работа** | 1. Удзел у рэспубліканскіх суботніках<br>2. Удзел у азеляненні школы |

## Заданне 4

**Пратакол наведанага ўрока**

**1.** 3 мая. Урок беларускай мовы ў 5 “Б”
1 урок па раскладзе (8.00 – 8.45)
Настаўніца: Раманоўская Іна Леанідаўна
Тэма: “Роля фразеалагізмаў у маўленні”
На ўроку прысутнічала 20 вучняў

**2.** Клас адпавядае санітарна-гігіенічным нормам, праветраны, дошка чыстая, на працоўных месцах парадак.

**3.** Наглядныя дапаможнікі: малюнкі, карткі.

**Мэта**: урок скіраваны на паўтарэнне і замацаванне ведаў па тэме і выяўленне ролі ўстойлівых моўных адзінак у маўленні; развіццёвая частка мэты накіравана на фарміраванне ўстойлівых маўленчых уменняў; выхаванне вучняў адбывалася праз выкарыстанне этнакультурнага моўнага матэрыялу

| Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў |
|---|---|
| 1. Арганізацыйны момант (настаўнік называе тэму, вызначае мэту і задачы ўрока) | Вучні ўважліва слухаюць. |
| 2. Праводзіцца праверка творчага задання (праілюстраваць фразеалагізм). Тыя, у каго ўзнікалі цяжкасці з заданнем, атрымліваюць дадатковае заданне: прыдумаць сказы са сваімі фразеалагізмамі. | Вучні актыўна ўключаюцца ў праверку дамашняга задання, дэманструючы аднакласнікам свае малюнкі. Хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем адгадваюць фразеалагізмы. |



Репозиторий ВГУ

| | |
|---|---|
| 3. Настаўнік раздае некалькім вучням карткі з заданнямі на замацаванне тэмы і выклікае аднаго вучня да дошкі (разбор сказа). | Тыя, хто атрымаў карткі, працуюць па іх. Астатняя частка класа дапамагае вучню, які працуе каля дошкі. |
| 4. Настаўнік паказвае напісаныя загадзя за дошкай словы і прапануе вучням перакласці іх на беларускую мову. Далей вучні ўспамінаюць фразеалагізмы з гэтымі словамі, складаюць і запісваюць сказы. | Дзеці ўсе разам робяць пераклад слоў. Працуе ўвесь клас. |
| 5. Настаўнік тлумачыць новы матэрыял з выкарыстаннем схем на дошцы (метад дэманстрацыі). Дэманструе адпаведнасць фразеалагізмаў пэўным часцінам мовы. | Вучні слухаюць, запісваюць прыклады настаўніка ў свае сшыткі. Задаюць пытанні. |
| 6. Настаўнік дае заданне на замацаванне новай тэмы з вучэбнага дапаможніка. | Вучні працуюць з тэкстамі, самастойна выконваюць заданні ў сшытках. Калі ўзнікаюць цяжкасці, задаюць пытанні. |
| 7. Настаўнік задае дамашняе заданне. Праводзіць інструктаж. Падводзіць вынікі ўрока і выстаўляе адзнакі ў журнал. | Вучні запісваюць дамашняе заданне ў дзённік і задаюць пытанні. |

**Вывады:** Урок быў вельмі эфектыўны. Мэты дасягнуты цалкам. Вучні змаглі падагульніць свае веды па тэме “Фразеалагізмы як адзінкі мовы”, а таксама паўтарыць тэму “Стылі маўлення”. Урок дапамог у павышэнні моўнай культуры вучняў. Вучні былі актыўныя, прымалі ўдзел у ходзе ўрока. Па чарзе выкарыстоўваліся калектыўны і індывідуальны віды працы, што было вельмі эфектыўна для актывізацыі дзейнасці вучняў. Вучні працавалі з задавальненнем. Вялася праца па развіцці навыкаў вуснага гаварэння. Урок быў насычаны інфармацыйна. Вучні сумленна працавалі самастойна, што таксама важна. Урок дапамог ў павышэнні моўнай культуры вучняў.

# УЗОРЫ АФАРМЛЕННЯ ПЛАНАЎ-КАНСПЕКТАЎ УРОКАЎ

**План-канспект заліковага ўрока па беларускай мове**
**ў 7 "Б" класе гімназіі № 3 г. Віцебска,**
**праведзенага студэнткай-практыканткай 5 курса ФБФК**
**Хоміч Кацярынай Анатольеўнай**

**Тэма**: ***Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку***

**Мэта**: садзейнічаць фарміраванню ў вучняў паняцця пра дзеепрыметнікавы зварот, яго структуру, месца і сінтаксічную ролю ў сказе; выпрацоўваць практычнае ўменне знаходзіць дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты ў тэкстах, вызначаць іх межы, правільна інтанаваць у маўленні; выхоўваць патрыятызм і паважлівыя адносіны да спадчыны беларускага народа.

**Абсталяванне**: вучэбны дапаможнік для 7 класа "Беларуская мова" (аўтары: Г. М. Валочка, С. А. Язерская), карткі з тэкстамі.

**Тып урока**: камбінаваны.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант**

**II. Праверка дамашняга задання**

Практыкаванне 51.

*Запішыце тэкст, ставячы дзеепрыметнікі, што ў дужках, у патрэбным родзе, ліку і склоне.*

*Пытанне: ад чаго залежыць род, лік, склон дзеепрыметніка? (назоўнік)*

НА ПАЛЯВАННІ

У самым канцы лета настаў вольны ад палявой работы час, і мужчыны вырашылі ісці на паляванне.

Ішлі доўга. І вось на выпален**ых**(мн.л, М. скл.)сонцам прагалінах пачала трапляцца змят**ая** і аб'едзен**ая**(ж.р, адз.л, Н. скл.)трава. Тут пасвілася, нагульвала мяса даўно непалохан**ая**(ж.р, адз.л, Н. скл.)дзічына. Загон паляўнічых праз дубняк выйшаў на нізоўе, дзе цёк ручай з вышмарган**ым** (м. р, адз.л, Т. скл.) мядзведзямі маліннікам на берагах. І каля самага ручая нечакана наткнуліся на статак. Здрыганулася зямля, калі статак усхапіўся на ногі, і адразу ж важак рынуўся на няпрошан**ых**(мн.л, В. скл.) гасцей.

На паляўнічых імчала такая раз'юшан**ая** (ж.р, адз.л, Н. скл.) аграмадзіна, што нават мужчыны не вытрымалі і з усіх ног кінуліся да выратавальнага лесу (Паводле М. Чарняхоўскага).

**III. Актуалізацыя апорных ведаў**

**Франтальнае апытванне:**

- *Што называецца дзеепрыметнікам*? (Дзеепрыметнік – форма дзеяслова, якая абазначае прымету прадмета паводле дзеяння і адказвае на пытанні які? якая? якое? якія?)
- *Якія граматычныя прыметы дзеяслова ўласцівы дзеепрыметніку?* (Дзеепрыметнік бывае закончанага і незакончанага трывання, прошлага і цяперашнага часу; незалежнага і залежнага стану).
- *Што агульнага ў дзеепрыметніка з прыметнікам?* (Дзеепрыметнік змяняецца па родах, ліках і склонах).
- *Якую ролю ў сказе выконвае дзеепрыметнік?* (азначэнне, выказнік)

**IV. Вывучэнне новага матэрыялу**

**Пошукава-даследчая праца**

1) Выкананне практ. 53. *Прачытайце сказы*.

- Скошаная трава ўжо добра падвяла на сонцы.



Репозиторий ВГУ

- /Скошаная раніцай/трава ўжо добра падвяла на сонцы.
- Трава, /скошаная раніцай/, ужо добра падвяла на сонцы.
- Ужо добра падвяла на сонцы трава, /скошаная раніцай/.

*Назавіце дзеепрыметнікі. Якія назоўнікі яны паясняюць?* (скошаная, скошаная раніцай, паясняюць назоўнік – трава).

*У якіх сказах дзеепрыметнік мае пры сабе залежнае слова?* (2, 3, 4 сказы: скошаная раніцай).

*Якое месца ў адносінах да паяснёнага ім назоўніка займае дзеепрыметнік з залежным словам?* (У другім сказе дзеепрыметнікавы зварот стаіць перад паяснёным словам – назоўнікам, у трэцім сказе – пасля паяснёнага і ў сярэдзіне сказа, у чацвёртым – пасля паяснёнага).

Пасля выканання практыкавання вучні павінны сфармуляваць адказ на пытанне: што такое дзеепрыметнікавы зварот? (адказ падмацоўваецца правілам на с.31).

2) Праца з тэкстам. Дзеці атрымліваюць карткі з тэкстамі (святы і абрады беларусаў).

Прачытайце тэксты і знайдзіце дзеепрыметнікавыя звароты.

Камаедзіца

З глыбокай старажытнасці прыйшло да нас свята пакланення мядзведзю, зафіксаванае ў XIX стагоддзі на Віцебшчыне.

Свята адзначаецца шостага красавіка. У гэты дзень рыхтуецца асаблівая ежа: сушаны рэпнік, кісель, гарохавыя камы, ад якіх і называецца само свята. Людзі весела спяваюць, каб мядзведзь прачнуўся ў лесе. Сяляне не працуюць, а святкуюць. Мужчыны, пераапранутыя ў мядзведзяў, ходзяць па хатах, дзе іх частуюць. Харчы, складзеныя ў торбе, носіць “мядзведзь”.

Святы Юр’я

На Юр’я, пятага мая, беларусы ўшаноўвалі сімвал парадку, вясны, росквіту прыроды. Дзяўчаты на лузе выбіралі самую прыгожую сяброўку і вадзілі каля яе карагоды. Сяброўка, выбраная моладдзю, была ўвасабленнем вясны і прыгажосці – багіні Лёлі. Вянкі, сплеценыя Лёляй, дзяўчаты берaглі да канца вясны. У гонар вясны-прыгажуні спявалі песні, прысвечаныя росквіту прыроды і прыгажосці.

3) На дошцы запісаны сказы (увага на інтанаванне). Вучні знаходзяць дзеепрыметнікавыя звароты.

1. У нагрэтым сонцам **бары** моцна пахла смалой.
2. **Неба**, густа ўсеянае зоркамі, яшчэ не пасвятлела.
3. Ля **берага**, аброслага алешнікам, на цёмнай вадзе ляжалі белыя лілеі.
4. Зарослая чаромхай **гара** крута абрывалася.
5. Высокая **трава**,густа акропленая расою, іскрылася сотнямі вясёлак на сонцы.
6. Акуратна пасыпаная пяском **дарожка** вяла да невялікага дома.

Ці звярнулі вы ўвагу на інтанацыю пры чытанні сказаў, у якіх ёсць дзеепрыметнікавыя звароты?

4) Выкананне практ. 54 (схема).

*Разгледзьце схему. Звярніце ўвагу на месца дзеепрыметнікавага звароту ў адносінах да паяснёнага ім назоўніка, на пастаноўку знакаў прыпынку.*

**V. Замацаванне вывучанага**

1. Праца з вучэбным дапаможнікам.

1) Выкананне практ. 55 (1, 3, 4 сказы).

*Спішыце, дапісваючы канчаткі дзеепрыметнікаў. Абазначце межы дзеепрыметнікавых зваротаў, выдзеліце паяснёныя імі назоўнікі. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку пры дзеепрыметнікавых зваротах.*



Рэпазіторый БДПУ

ПАРАДЫ ДАЎНІЯ І СУЧАСНЫЯ

1.Бялізна ў марозны дзень не прымерзне да вяроўкі, якую папярэдне працёрлі **анучай** (ж.р., адз.л., Т. скл.), змочан(ай) ў растворы солі.

2. Калі тварог загарнуць у чыстую **марлю** (ж.р., адз.л., В. скл.), змочан(ую) у салёнай вадзе, то ён захаваецца свежым не на адзін дзень.

3. Замёрзл(ае) **акно** добра пратрэцца змочан(ай) у салёнай вадзе **анучай**.

**VI. Паўтарэнне і абагульненне вывучанага**

1) Праца ля дошкі.

**Заданне**: запісаць сказы пад дыктоўку, паставіць знакі прыпынку, дзе трэба, абазначыць межы дзеепрыметнікавага звароту.

1) Між дрэў жаўцела роўная дарожка,/пасыпаная пясочкам/(І. Мележ).

2) /Схопленыя жаўцізной/дрэвы свяціліся пад нізкім сонцам (А. Жук).

3) Лес,/асветлены і абагрэты сонцам/, пазіраў зусім весела (Якуб Колас).

4) Сівая зямля,/высушаная марозам/, была прысыпана лёгкім снегам (В. Адамчык).

5) Яна, /стомленая цяжкай працай/, прыйшла дадому.

Паўтарыць асноўныя палажэнні правіла на аснове дадзеных прыкладаў.

2) Вуснае выкананне практ. 56.

*Прачытайце тэкст, захоўваючы правільную інтанацыю пры чытанні сказаў з дзеепрыметнікавымі зваротамі. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў гэтых сказах.*

Паветра, /**прасякнутае пахамі зямлі**/, крышталька чыстае (дзеепрыметнікавы зварот стаіць пасля паяснёнага ім назоўніка і знаходзіцца ў сярэдзіне сказа). Далягляд вырысоўваецца выразна, акрэслена.

–Эх! – вырываецца з грудзей майго субяседніка. – Шырыня якая! Воля! Аж дух зацінае.

Ён стаіць, шырока і моцна расставіўшы ногі, нібы ўросшы ў зямлю, прыземісты, шыракаплечы. На ім – /**ссунутая на патыліцу**/ салдацкая вушанка і старыя боты, /**запэцканыя суглінкам**/ (дзеепрыметнікавы зварот стаіць пасля паяснёнага слова). Водбліск сонечнага заходу асвятляе яго скуласты твар задрослай бародкай і вузкімі шэрымі вачыма (Паводле Т. Хадкевіча).

**VII. Дамашняе заданне**: §7, практ. 57.

**VIII. Падвядзенне вынікаў урока**

- Што такое дзеепрыметнікавы зварот?
- Якія знакі прыпынку ставяцца пры дзеепрыметнікавым звароце?

Рэпазіторый ВДУ

**План-канспект**
**заліковага ўрока па беларускай літаратуры**
**ў 7 “Б” класе гімназіі № 3 г. Віцебска,**
**праведзенага студэнткай-практыканткай**
**5 курса ФБФК Хоміч Кацярынай Анатольеўнай**

***Тэма:*** Вобраз прыроды ў вершаваных і празаічных творах (Якуб Колас. “Ручэй”;*Т. Хадкевіча “Крынічанька”)*

***Мэта ўрока:*** пазнаёміць вучняў з уступным артыкулам да раздзела “У вершах і ў прозе”; выпрацоўваць уменне заўважаць дэталі і перадаваць іх, выкарыстоўваючы прыём вуснага малявання; пашыраць слоўнікавы запас вучняў; параўнаць паказ аднолькавай з’явы прыроды ў паэтычным творы Якуба Коласа “Ручэй” і празаічным творы Т. Хадкевіча “Крынічанька”; развіваць здольнасць адклікацца на аўтарскае паэтычнае ўспрыманне свету, якое выяўляецца праз прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці; выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды і бачыць яе хараство.

***Абсталяванне*:** *вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 7 класа (аўтары: М.А. Лазарук, Т.У. Логінава), рэпрадукцыя карціны В. Цвіркі “Ручай”, карткі-схемы пабудовы сінквейна.*

***Тып ўрока*:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Ход урока**

I. **Арганізацыйны момант.** Абвяшчэнне тэмы і мэты ўрока.
II. **Псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу.**
III. Чытанне артыкула “У вершах і ў прозе”, запаўненне параўнальнай табліцы.

| Адрозненні | Вершаваныя творы | Празаічныя творы |
|---|---|---|
| Па знешніх адзнаках | | |
| Па асаблівасцях мовы | | |

IV. **Вывучэнне новага матэрыялу.**
1. *Слова настаўніка.*

Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) нарадзіўся 3 лістапада 1882 г. у засценку Акінчыцы ў сям’і малазямельных сялян. Бацька, Міхаіл Казіміравіч, працаваў лесніком, таму вырас паэт на ўлонні прыроды. З маленства любіў назіраць за з’явамі прыроды, бываць на рэчцы, у полі, у лесе. Жыў у адзінстве з прыродай. Усё гэта спрыяла развіццю яго назіральнасці, выхоўвала любоў да прыроды.

Якуб Колас – таленавіты пісьменнік, які быў надзелены прыроднай здольнасцю заўважаць прыгажосць і перадаць яе ў сваіх творах. У іх паэту ўдалося тонка і глыбока ўвасобіць прыгажосць прыроды, раскрыць духоўную еднасць з ёю чалавека (гэта непарыўнае цэлае), паказаць, наколькі багатае і разнастайнае жыццё таго чалавека, які бачыць, разумее і адчувае характар навакольнага свету.

Рэпазіторый ВДУ

2. *Чытанне верша* (твор чытае настаўнік).
3. *Самастойнае чытанне верша вучнямі*.
4. *Праверка першага ўспрынящця:*

Ці спадабаўся вам гэты верш? Якія пачуцці ён выклікаў?

5. *Гутарка па змесце твора:*

1) Сфармулюйце тэму і вызначце ідэю верша?
2) Якім вам уяўляецца лірычны герой верша?
3) З дапамогай якіх вобразна-выяўленчых сродкаў створаны мастацкія вобразы верша? Якая іх роля ў вершы? (выпісаць у сшыткі):

- Эпітэты (эпітэт – мастацкае азначэнне (не абавязкова выражанае прыметнікам), якое вобразна характарызуе прадмет, чалавека або *жыццёвую* з'яву). Эпітэты ў вершы выклікаюць зрокавыя ўяўленні (можам уявіць ручаёк), дапамагаюць адчуць адносіны пісьменніка да ручая (жэўжык-пястун). Напрыклад, срэбразвонны ручэй; спеў несціханы, густы; жэўжык-пястун (так аўтар называе распешчаны ручэй), ручэй сярдзіта бубніць і лагодна пяе, гучным смехам.
- Параўнанні (параўнанне – гэта мастацкі вобраз, пабудаваны на супастаўленні дзвюх з'яў ці двух прадметаў на аснове іх падабенства ці адрознення). Параўнанні дапамагаюць стварыць каларытны малюнак прыроды (ручайка), зрокавае ўяўленне, перадаць прыгажосць прыроды. Напрыклад, "Як матулька, вярба/ Хіліць голаў над ім" (схіленая над ручаём вярба параўноўваецца з матулькай).
- Увасабленні (персаніфікацыя – наданне чалавечых уласцівасцей рэчам, прадметам, з'явам прыроды). Гэта такое адлюстраванне неадушаўлёных прадметаў, раслін або жывёл, пры якім яны гавораць, думаюць і адчуваюць, як чалавек. Напрыклад, "А ён, жэўжык-пястун, / Гучным смехам дрыжыць"; кусты глядзяцца; чараты, асака абступаюць ручэй; мурог падыходзіць; зорка кіне зрок; хмурынка зазірне).

**Вывад.** Вобразна-выяўленчыя сродкі дапамагаюць паэту стварыць прыгожую карціну прыроды і выявіць сваё захапленне ёю.

4) Якім бачыць паэт ручаёк? Давайце паспрабуем яго ахарактарызаваць. Але зробім гэта наступным чынам. Я называю рысы, а вы радкамі з тэксту абгрунтоўваеце маю думку.

а) Ён вясёлы і гарэзлівы:
"А ён, жэўжык-пястун
Гучным смехам дрыжыць".

б) Ён пяшчотны і ласкавы:
"Як матулька, вярба
Хіліць голаў над ім".

в) Ён сумны і журботны:
"І хмурынка не раз
Зазірне ў ручаёк".

6. *Вуснае славеснае маляванне.*

— Калі б вы валодалі здольнасцю перадаць напісанае Якубам Коласам у карціне, што б вы намалявалі? Якія фарбы пераважалі б на вашым палатне?

7. Рэпрадукцыя карціны В. Цвіркі "Ручай", параўнанне з вершам "Ручэй" Якуба Коласа.

♦ *Гутарка*:

— Якім ручаёк вы бачыце ў карціне В. Цвіркі? Якія фарбы пераважаюць? Якія эпітэты вы можаце падабраць, гледзячы на карціну? Параўнайце з ручайком, які



Рэпазіторый ВГУ

апісаў нам Якуб Колас у сваім вершы. Ці падобныя яны? Што б вы змянілі ў карціне?

8. Сінквейн. Складзі сінквейн да слова “ручай”.

1 радок – адно ключавое слова.
2 радок – два прыметнікі, якія характарызуюць гэта паняцце.
3 радок – тры дзеясловы, якія абазначаюць дзеянне ў межах зададзенай тэмы.
4 радок – кароценькі сказ, які раскрывае сутнасць тэмы ці адносіны да яе.
5 радок–сінонім ключавога слова ці абагульняльнае слова (назоўнік).

9. Чытанне ўрыўка з празаічнага твора Т. Хадкевіча “Крынічанька”.

10. **Гутарка па змесце твора**:

1) Вызначце тэму ўрыўка, асноўную ідэю?
2) Знайдзіце і зачытайце аўтарскае апісанне крынічкі.

*І там, унізе, ля купкі раскідзістага вербалозу, булькала крынічка. З кручы яна здавалася люстэркам, намнога святлейшым, чым вада ў Дзвіне. Але люстэрка тое, калі прыгледзецца ўважліва, не было застылае. Яно жыло, варушылася, пералівалася цераз ніжэйшы край, і імклівыя струменьчыкі праклалі ў траве і прыбярэжным пяску раўчукі з Дзвіны. Бурліць, пляскоча крынічка. Імклівымі раўчукамі пераліваецца, сцякае з яе ў Дзвіну крыштальная вада, і магутная задумлівая рака нібы прыслухоўваецца да яе гоману, булькату. Пераліваецца, сцякае па раўчуках ў траве і пяску вада, а крынічка заўсёды поўная.*

3) Ці толькі аўтарскае апісанне крынічкі прапанавана ва ўрыўку? Знайдзіце і зачытайце апісанне крынічкі, якое аўтар укладвае ў вусны Петруся.

П’еш крыштальнай чысціні ваду і бачыш, як глыбока на дне варушыцца жвір і каменьчыкі, нібы нехта нябачны гуляе з імі, і чуеш, як пляскоча крынічка, быццам яна размаўляе з табой. Вада ж сцюдзёная, смачная, нап'ешся і адчуваеш, як у цябе прыбавілася бадзёрасці і сілы.

4) Адшукайце ўспаміны і разважанні Нічыпара, якія дапамагаюць убачыць крынічку і раскрыць яе лекавыя ўласцівасці.

Яна *амаль не змянілася за доўгія гады яго* жыцця – такая ж, як і даўней, празрыстая і гаманлівая… *А* калі які злы паляўнічы-*браканьер параніць беланогага* прыгажуна лася, дык лось прыходзіць сюды, п’е з крынічкі, і рана неўзабаве *загойваецца.*

5) Якую ролю ў стварэнні вобраза крынічкі адыгрываюць успаміны і разважанні Петруся і Нічыпара?

У празаічным творы вобразы ствараюцца з дапамогай падрабязных апісанняў. Гэта і аўтарскае апісанне, і ўспаміны Петруся і Нічыпара.

11. *Вуснае славеснае маляванне*.

— Намалюйце словамі крынічку, як вы яе ўяўляеце.

12. Параўнанне прачытаных тэкстаў. Параўнанне можа весціся ў наступных кірунках:

— Чым адрозніваецца ўрывак празаічнага твора ад папярэдняга верша на тую ж тэму? Ці можна ў яго мове выдзеліць такія ж, як у вершы, роўныя па колькасці складоў часткі, радкі? Ці ёсць у ім сугучныя словы, рыфмы?

— Ці аднолькавую ролю ў стварэнні вобразаў у паэтычным і празаічным творы выконваюць вобразна-выяўленчыя сродкі? (У вершаваным творы Я. Коласа “Ручэй” багата розных паэтычных прыёмаў – параўнанняў, эпітэтаў, метафар і г.д.; гэта яны робяць на чытача такое моцнае ўражанне. У празаічным творы Т. Хадкевіча “Крынічка” таксама ўжываюцца сродкі мастацкай выразнасці, але яны застаюцца як бы незаўважанымі, бо не на гэтым акцэнтуе ўвагу аўтар. Галоўнае ў



Репозиторий ВГУ

празаічным творы – дакладнае апісанне з'явы ці прадмета, таму аўтар акцэктуе ўвагу на шматлікіх падрабязнасцях).
V. **Дамашняе заданне:** вывучыць верш "Ручэй" на памяць.
VI. **Падвядзенне вынікаў урока**. Выстаўленне адзнак.

## УЗОР СПРАВАЗДАЧЫ ПА ВЫНІКАХ ВЫТВОРЧАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ
## студэнтак 51 групы ФБФК ВДУ імя П.М. Машэрава Недзведзь Вікторыі і Хоміч Кацярыны,

*Школа – гэта не толькі вучоба!*
*Школа – гэта крок у Жыццё.*

Вучэбны 2012 год пачаўся для нас не так, як звычайна, бо ўпершыню ў жыцці мы сустрэлі Дзень ведаў не ў якасці вучняў ці студэнтаў, а ў якасці настаўнікаў.

Па размеркаванні мы апынуліся ў гімназіі № 3 г. Віцебска імя А.С. Пушкіна. Гімназія гасцінна расчыніла перад намі свае дзверы. Адміністрацыя сустрэла нас ветліва і добразычліва. Дырэктар гімназіі, намеснік дырэктара, школьны псіхолаг і сацыяльны педагога хвотна расказалі нам пра асаблівасці гімназічнага жыцця, а іх пажаданні натхнілі нас на плённую працу.

У гімназіі для нас былі створаны ўсе ўмовы для працы. У нашым распараджэнні была бібліятэка, у якой мы праводзілі нямала часу пры падрыхтоўцы да ўрокаў, класных гадзін і мерапрыемстваў. Як вядома, гімназія падтрымлівае цесную сувязь з Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П.М. Машэрава: вынікам гэтага супрацоўніцтва стала стварэнне сумеснага вучэбна-навукова-кансультацыйнага цэнтра. Метадычны цэнтр – выдатная база для падрыхтоўкі маладых педагогаў. Тут сабраны лепшыя метадычныя распрацоўкі настаўнікаў і студэнтаў, фотаздымкі з розных мерапрыемстваў, у тым ліку "Пушкінскіх баляў" і мноства іншай карыснай інфармацыі.

Размеркавалі нас у 7-я класы. Безумоўна, мы вельмі хваляваліся перад знаёмствам з дзецьмі, але яны сустрэлі нас вельмі прыязна. Дзякуючы класным кіраўнікам, якія нас заўсёды падтрымлівалі і дапамагалі, мы вельмі хутка наладзілі добрыя адносіны з дзецьмі. За перыяд практыкі – з 1 верасня па 23 лістапада – кожнаму з нас неабходна было правесці 16 залікавых урокаў. Спачатку нам здавалася, што гэта "місія" невыканальная, але, як кажуць, у страха вочы вялікія. На справе ўсё аказалася намнога прасцей і цікавей.

Репозиторий ВГУ

403 кабінет – кабінет беларускай мовы – на час практыкі стаў нам амаль родным. Менавіта тут мы атрымалі каласальны вопыт, паспрабаваўшы сябе ў ролі настаўнікаў. Працаваць нам давялося пад кіраўніцтвам цудоўных настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры – Дзянісавай Святланы Дзмітрыеўны і Мацвеевай Алены Антонаўны, якія з'яўляюцца сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы. Менавіта яны сталі для нас прыкладам, на які ў далейшым мы будзем раўняцца. Яны ахвотна падзяляліся з намі сваім вопытам, дапамагалі пры падрыхтоўцы да ўрокаў і заўсёды падтрымлівалі нас у нашай дзейнасці.

Першыя ўрокі… Хваляванне, няўпэўненасць у сваіх сілах, боязь штосьці не паспець ці забыцца. Літаральна праз 2 урокі ўсе гэтыя пачуцці быццам зніклі. На змену ім прыйшла ўпэўненасць, усведамленне таго, што ты цяпер настаўнік і менавіта ад цябе залежыць духоўнае станаўленне вучняў і ўзровень іх ведаў. Мы стараліся, каб адзін урок быў не падобны на другі, падбіралі цікавы матэрыял, ілюстрацыі, выкарыстоўвалі розныя формы дзейнасці. На ўроках беларускай мовы і літаратуры мы імкнуліся далучыць дзяцей да нашай нацыянальнай культуры і традыцый. У выніку ўрокі атрымаліся цікавымі і пазнавальнымі.

Падчас практыкі мы паспрабавалі сябе і ў ролі класных кіраўнікоў – праводзілі з вучнямі выхаваўчыя гутаркі і тэматычныя класныя гадзіны. Дзеці з задавальненнем ішлі на кантакт, дапамагалі ў падрыхтоўцы і правядзенні розных мерапрыемстваў. Самай запамінальнай падзеяй нашай практыкі стала выхаваўчае мерапрыемства "Без іх імёнаў я Беларусь не ўяўляю…", прысвечанае 130-годдзю з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Да гэтага мерапрыемства мы рыхтаваліся вельмі старанна, імкнуліся задзейнічаць максімальную колькасць дзяцей, улічваючы іх здольнасці і таленты. Неаднойчы мы збіраліся на рэпетыцыі, якія праходзілі пры кожнай зручнай магчымасці. Дзеці адказна падышлі да падрыхтоўкі сваіх выступленняў, сталі нашымі надзейнымі памочнікамі.

Мерапрыемства ўяўляла сабой канцэрт-прэзентацыю пра жыццё і творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа. Яно складалася з трох частак: у першай частцы мы пазнаёмілі гледачоў з біяграфіяй пісьменнікаў, другая частка расказвала пра іх творчыя дасягненні,



Рэпазіторый ВДУ

уклад у развіццё беларускай літаратуры. У гэтай частцы прагучала песня "Мой родны кут…" у выкананні вучаніц 7 "А" класа. Безумоўна, вечар не абыйшоўся без чытання вершаў самай разнастайнай тэматыкі. Асаблівым упрыгожаннем мерапрыемства стаў народны танец "Заплятанка", які выканалі вучаніцы 7 "В" класа. Сярод 7-ых класаў былі аб’яўлены пераможцы конкурса на лепшую насценгазету.

Узнагароджанне прайшло ў 4-х намінацыях: "За ілюстрацыйнасць", "За знаходлівасць", "За творчы падыход", а таксама "Самая інфармацыйная насценгазета". Фінальным акордам стала песня "Спадчына", напісаная на словы Янкі Купалы. Выканалі яе вучаніцы 7 "Б" класа.

Тры месяцы нашай практыкі праляцелі непрыкметна, і надышоў час развітвацца са стаўшай намужо роднай гімназіяй. Гэта быў бясцэнны вопыт: як прафесійны, так і жыццёвы. Зыходзячы з гэтага вопыту, нельга не пагадзіцца з наступнымі выказваннямі знакамітых людзей:

♦ Каб быць добрым выкладчыкам, трэба любіць тое, што выкладаеш, і любіць тых, каму выкладаеш (Васіль Ключэўскі).

♦ Настаўнік павінен мець максімум аўтарытэту і мінімум улады.

(Т. Шаш)

♦ Навучаць – значыць удвая вучыцца (Ж. Жубер).

♦ Сакрэт паспяховага выхавання заключаецца ў павазе да вучня (Р. Эмерсан).

♦ Настаўнік працуе над самай адказнай задачай – ён фарміруе чалавека (М. Калінін).

Скончыць справаздачу хацелася б словамі з песні

Школа – это мир, целый мир –
мозаика историй,
вспышки ярких чувств,
фейерверк – веселый сериал.
Школа – это мир.
Мир любви, мир слез,
мир чувств, мир грез.
Мир, в котором каждый был,
Мир, который жизни научил.



Репозиторий ВГУ

ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1. Гамеза, Л. М. Задачы і змест педагагічнай практыкі студэнтаў-філолагаў ВНУ / Л. М. Гамеза // Практыка як састаўная частка працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў: матэрыялы Рэсп. міжвуз. навук.-метад. канф. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 2000. – С. 29–32.

2. Горленко, В. П. Педагогическая практика студентов: развитие научных основ / В. П. Горленко; под ред. И. Ф. Харламова. – Минск, 2002.

3. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии / Н. И. Запрудский. – Минск, 2006.

4. Звоник, И. Я. Содержание и организация педагогической практики: учеб.-метод. пособие для студентов-практикантов географического и филологического факультетов: в 2 ч. / И. Я. Звоник, Л. С. Полякова. – Минск, 2006.

5. Кульневич, С. В. Воспитательная работа в современной школе. Воспитание: от формирования к развитию / С. В. Кульневич, Т. П. Лакоценина; ТЦ "Учитель". – М. – Ростов н/Д, 2000.

6. Ляшчынская, В. А. Педагагічная практыка студэнтаў-філолагаў / В. А. Ляшчынская, В. І. Смыкоўская. – Мінск, 1983.

7. Мартынкевіч, С. В. Методыка выкладання беларускай мовы : вучэбна-метадычны комплекс / С. В. Мартынкевіч. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2007. – 45 с.

8. Методика воспитательной работы: учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / Л. А. Байкова [и др.]; под ред. В.А. Сластенина. – М., 2004.

9. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэб. дапам. / пад рэд. В.Я. Ляшук. – Мінск, 1999.

10. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб.дапам.для студэнтаў філал.спецыяльнасцей установ, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Минск, 2007.

11. Настольная книга для преподавателя / авт.-сост. И. Н. Кузнецов. – Минск, 2005.

12. Непрерывное воспитание детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь: Концепция; Программа на 2006–2010 гг. – Минск: НИО, 2007.

13. Педагогическая практика студентов: теоретич. основы и опыт организации / В. П. Тарантей, Л. И. Прокопьев, И. А. Карпюк [и др.]; под ред. В. П. Тарантея. – Гродно, 2004.

Репозиторий ВГУ

14. Педагогическая практика / Г. М. Коджаспирова, Л. В. Борикова, Н. И. Бостанжиева; под ред. Г. М. Коджаспировой. – М., 1998.

15. Педагогическая практика: концептуальные подходы, программа и метод. рекомендации: учеб. пособие / авт.-сост. Т. А. Шангирей [и др.]. – Минск, 1999.

16. Педагогическая практика: справочник: учеб.-метод. пособие / авт.-сост. М. Е. Сысоева. – М., 2002.

17. Саўко, У. П. Афармленне канспекта ўрока па беларускай мове / У. П. Саўко // Бел. мова і літ. – 2008. – № 6. – С. 8–12.

18. Селевко, Г. К. Современные образовательные технологии / Г. К. Селевко. – М., 1998.

19. Симонов, В. П. Педагогическая практика студентов: учеб.-метод. пособие для преподавателей и студентов / В. П. Симонов. – М., 2000.

20. Урок беларускай мовы : метадычныя рэкамендацыі / С. В. Мартынкевіч. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2005. – 36 с.

21. Чепиков, В. Т. Педагогическая практика: учеб.-практ. пособие / В. Т. Чепиков. – Минск, 2004.

22. Якуба, С. М. Некаторыя пытанні педагагічнай практыкі студэнтаў-філолагаў / С. М. Якуба // Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ: зб. навук. арт. пам. праф. В. У. Протчанкі / пад рэд. Л. А. Мурынай. – Мінск, 2003. – С. 87–90.

23. Якуба, С. М. Урокі педагагічнай практыкі студэнтаў-філолагаў / С. М. Якуба // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. – Вып. 4: да 75-годдзя з дня нарадж. праф. Л. І. Бурака / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск, 2005. – С. 168–172.

**Дадатковая**

1. Артеменко, З. В. Формы воспитательной работы с молодежью: организация и методика проведения / З. В. Артеменко, Ж. Е. Завадская; под ред. А.П. Сманцера. – Минск, 2000.

2. Беларускія народныя гульні і забавы / ускл. К. Л. Лабачэўская. – Мінск, 1990.

3. Букатов, В. М. Педагогические таинства дидактических игр / В. М. Букатов. – М., 1997.

4. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / уступ. арт. А. І. Гурскага. – Мінск, 1990.

5. Малажай, Г. М. Пазакласная праца па беларускай мове / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. – Мінск, 1980.

6. Сценарии школьных праздников: экология / НМО "Педагог". – Вып. 8. – М., 1998.



Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

Прадмова ………………………………………………………… 3

Мэты, задачы і функцыі педагагічнай практыкі студэнтаў-філолагаў ………………………………………………………… 4

Тэрміны педагагічнай практыкі ……………………………….. 8

Азнаямленчая і азнаямленча-адаптацыйная практыкі ………… 9

Вытворчая педагагічная практыка ……………………………… 21

Дадатак ………………………………………………………… 31

Літаратура ………………………………………………………. 44

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

**МАРТЫНКЕВІЧ** Святлана Васільеўна

**ВУЧЭБНАЯ І ВЫТВОРЧАЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА СТУДЭНТАЎ-ФІЛОЛАГАЎ**

Метадычныя рэкамендацыі

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп'ютарны дызайн *І.У. Волкава*

Падпісана ў друк .2013. Фармат 60х84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 2,73. Ул.-выд. арк. 2,09. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
ЛВ № 02330/110 ад 30.01.2013.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ